

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ – НАВІНЫ І ПАРАДЫ

ЧЗ

ПРАФЕСІЯ СЦЮАРДЭСЫ: УСЯ ПРАЎДА

ЧЗ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родная мове

# ЗВЯЗДА

5 ЛІПЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 126 (28742)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Пры продажы ўчастка зямлі з аўкцыёну неабходна больш даступна і дакладна паведамляць, што на гэтым участку прадугледжана, ці ёсць камунікацыі: святло, газ, вада. Каб чалавек, купляючы зямлю, адразу разумеў, што атрымае. Напэўна, тлумачэнне сітуацыі здыме многія праблемы і пытанні, ва ўсіх нас будзе разуменне».*

## КОРАТКА

- Віншаванні з Днём Незалежнасці паступаюць на адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў. У ліку тых, хто накіраваў віншаванні, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, Папа Рымскі Францыск, каралева Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Лізавета II, генеральны сакратар ААН Антоніу Гуцерыш, старшыня КНР Сі Цзіньпін, прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон і іншыя.
- **Да 28 градусаў цяпла чакаецца сёння па паўднёвым захадзе Беларусі.**
- Пастановай Савета Міністраў ад 29 чэрвеня 2018 года № 515 скарэктаваны правілы бытавога абслугоўвання спажыўцоў, а таксама Палажэнне аб парадку аказання паслуг па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў у майстэрнях, размешчаных на тэрыторыі гаражных кааператываў.
- **Рэспубліканскі праект «Кормім грудзьмі», які прымеркаваны да Сусветнага тыдня груднога кармлення (1—7 жніўня), стартуе ў Беларусі 15 ліпеня.**

ISSN 1990 - 763X

# МАРОЗАВА СЯДЗІБА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Браты Міхаіл і Пётр МАРОЗЫ жывуць у вёсцы Слабодка Бешанковіцкага раёна. Пераехалі сюды з суседняй Сенькаўшчыны сем гадоў таму, бо там ужо не засталося жыхароў. Наогул, у Марозаў пяць братоў, і ўсе яны жывуць у вёсцы. А ў Слабодцы дом братоў Марозаў самы прыкметны, з малюнкам на варотах, які самі сабе прыдумалі і намалявалі ўсё разам — і прыроду, і казку, і ўсмешку.**

**— Мы не любім сумаваць, стараемся падтрымліваць парадак на падворку і на вуліцы — без справы не сядзім, — кажуць Міхаіл і Пётр. — А наконт жывапісу, дык ніякія мы не мастакі, першы раз узялі пэндзлі.**

**Калісьці браты працавалі ў Віцебску на заводах, былі класнымі спецыялістамі, але азёрная радзіма ўсё-такі пацягнула да сябе. А на гэтым здымку браты якраз паднаўляюць сваю карціну, якая крыху паблякла пад сонцам.**

■ Спадчына ў законе

# ВОБРАЗЫ ПАМЯЦІ

## Праводзячы добраўпарадкаванне, важна не нашкодзіць



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Магіла маці Янкі Купалы — адна са шматлікіх адметных пахаванняў, якія ёсць тут.

**На Вайсковых могілках у беларускай сталіцы складваецца не самая простая сітуацыя. На момант, калі я наведала іх, там вяліся работы па рэканструкцыі — фактычна ж адбываўся дэмантаж многіх гістарычна важных надмагілляў. Спецыялізаваны камбінат сацыяльна-бытавога абслугоўвання агулам плануе прыбраць на могілках 40 % агароджаў, помнікаў і надмагілляў. І гэта пры тым, што могілкі з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю вельмі высокай, 2-й, катэгорыі. Атрымліваецца, у спрэчку ўступаюць адначасова Кодэкс аб культуры і закон «Аб пахаваннях і пахавальнай справе». Але ёсць пытанні, наколькі слушна апошні выкарыстоўваецца ў згаданай сітуацыі, калі ён практычна супярэчыць першаму. «Звязда» паспрабавала разабрацца ў праблеме.**

Кодэкс аб культуры прадугледжвае, што любыя работы на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны 1-й і 2-й катэгорыі абавязкова ўзгадняюцца з Міністэрствам культуры. Для 3-й катэгорыі такая працэдура не з'яўляецца абавязковай, аднак і ў гэтым выпадку ёсць патрабаванне напярэдадні работ праводзіць абавязковыя навуковыя вышуканні. Прадстаўнікі спецкамбіната сцвярджаюць, што адпаведныя вышуканні праводзіліся некалькі гадоў таму. Аднак ні склад людзей, якія ўваходзілі ў камісію і займаліся гэтымі работамі, ні навуковага кіраўніка назваць не пагадзіліся.

СТАР. 13

# Што вінен, аддаць павінен

## Дапамагчы спагнаць доўг могуць... сацыяльныя сеткі

**Сабраўся Віталь на адпачынак з сям'ёй на мора ехаць. Яшчэ і крэдыт вырашыў узяць, каб не адмаўляць сабе ні ў чым у водпуску. А яму ў банку кажуць, што не толькі грошай не дадуць, а яшчэ і з яго возьмуць за восем штрафных квітанцый за перавышэнне хуткасці. Ды і за мяжу ён не выедзе, пакуль з запазычанасцю не разбярэцца, бо яго правы на гэта як даўжніка абмежавалі. Аплаціў усё, небарака, сабраўся праз тыдзень ехаць, а яго ўсё роўна не пускаюць, бо пагранічнікам яшчэ інфармацыя не прыйшла, што ён больш нічога не вінен...**

**Што рабіць, каб не апынуцца ў падобным становішчы? У якіх правах лепш абмежаваць даўжніка, каб найхутчэй вярнуць грошы? Як спагнанніку даведацца, ці ёсць маёмасць і каштоўныя рэчы ў таго, каму ён пазычаў? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнт «Звязды» шукала разам з галоўным судовым выканаўцам Беларусі Дзмітрыем КАВАЛЕНКАМ.**

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ПАСТАВІЦЬ ІНВЕСТЫЦЫІ НА РЭЙКІ

## Як зрабіць Беларусь яшчэ больш прывабнай для замежнага бізнесу?

**Адказ на гэта пытанне сумесна шукалі дэпутаты, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, бізнес-суполак падчас круглага стала «Міжнародная прававая практыка работы з замежнымі інвестарамі і магчымасці паляпшэння інвестыцыйнай прывабнасці Рэспублікі Беларусь». Пляцоўку для сустрэчы дало адно з найбольш паспяховых прадпрыемстваў з замежным капіталам «Штадлер Мінск».**

Завод «Штадлер» у Фаніпалі — адно з падраздзяленняў аднайменнай швейцарскай кампаніі, якая працуе ў галіне распрацоўкі, праектавання, канструявання і вытворчасці рэйкавага рухомага саставу. Прадпрыемства стварае тралейбусы, трамваі, пасажырскія вагоны для краін СНД і Еўропы. Акрамя таго, цяпер «Штадлер» выпрабляе цягнікі для трэцяй лініі Мінскага метро.

Сёння на заводзе ў Фаніпалі працуе 700 чалавек, якія выпрабляюць каля 20 % прадукцыі ўсёй групы кампаній. У планах дадаткова інвеставаць у прадпрыемства 35 млн еўра, пашырыць магутнасці і павялічыць штат амаль да 1000 работнікаў.

**Дырэктар кампаніі «Штадлер Мінск» Філіп БРУНЕР** растлумачыў, чаму некалькі гадоў таму для будаўніцтва філіяла кампанія абрала Беларусь: «Краіна нам геаграфічна бліжэйшая. Беларусь і Мінская вобласць знаходзяцца ў добрым месцы адносна Заходняй Еўропы. Нам дзяржава прапанавала льготы, інвестыцыйны дагавор, свабодную эканамічную зону і магчымасці адкрыць свабодную мытную зону. І канешне, важна, што Беларусь уваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз».

Акрамя гэтага, сярод плюсаў інвестыцыйнага клімату Беларусі — высокі ўзровень чалавечага патэнцыялу, развітая транспартная сістэма, сацыяльна-палітычная стабільнасць, а таксама каля 60 двухбаковых пагадненняў аб абароне інвестыцый. Разам з тым унутраны патэнцыял эканомікі краіны не забяспечвае ў поўным аб'ёме інвестыцыйныя патрабаванні. Таму прыцягненне знешняга капіталу і павышэнне прывабнасці Беларусі для бізнесу — актуальнае пытанне для ўсіх галін улады.

З мінулага года захоўваецца тэндэнцыя ажыўлення інвестыцый, прырост за студзень—май 2018-га склаў 115 %.

У апошнія гады прымаліся меры па ўдасканаленні інвестыцыйнага заканадаўства, якія далі станоўчы эфект для эканамічнага росту.

«Палепшаны ўмовы дзейнасці свабодных эканамічных зон, зніжаны крытэрый па аб'ёме інвестыцый у рэалізацыю праектаў з 1 млн еўра да 500 тысяч еўра пры ўмове інвеставання на працягу трох гадоў з моманту рэгістрацыі. Прэзідэнтам дадзены шэраг кампенсацыйных ільгот у сувязі з адменай мытных ільгот з 1 студзеня 2017 года», — кажа **Алена ПЕРМІНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцыйнай палітыкі Міністэрства эканомікі Беларусі.**

Удасканалены ўмовы для індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Для рэзідэнтаў устаноўлены падатковы рэжым «дзесяць плюс». Акрамя таго, іх пазбавілі ад зямельных падаткаў і падатку на нерухомасць, спрасцілі адміністрацыйныя працэдуры і інш.

Вынікамі ўсіх гэтых паляпшэнняў стала рэгістрацыя ў СЭЗ у 2017 годзе 35 новых прадпрыемстваў з аб'ёмам заяўленых інвестыцый 130 млн долараў ЗША. На гэты момант пазначаны 24 новыя рэзідэнты з капіталам 441 млн долараў. У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку на гэты момант значацца 13 новых рэзідэнтаў.

Аб'ём экспарту паслуг Парка высокіх тэхналогій за мінулы год склаў больш за 1 млрд долараў. На чэрвень гэтага года ў яго склад увайшло амаль 300 рэзідэнтаў. Колькасць павялічылася на трэць з моманту прыняцця Дэкрэта аб лічбавай эканоміцы. Па словах спецыяліста, зараз нават існуе чарга на разгляданне дакументаў аб рэзідэнцтве.

Адзначыла Алена Пермінава і моманты, якія негатыўна ўплываюць на інвестыцыйную прывабнасць, — суб'ектыўныя розначытанні прававых нормаў, слабое прасоўванне інвестыцыйнага патэнцыялу, адсутнасць вынікаў прыватызацыйных працэсаў, недахоп стратэгічнага планавання, кадравая праблема, бюракратызм на месцах.

**Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы** (яна разам з Пастаяннай камісіяй па міжнародных справах выступіла ініцыятарам круглага стала), паведаміў аб прыняцці ў другім чытанні Закона аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Дакумент дае магчымасць ажыццяўляць шэраг важных ініцыятыў.

«Атрымліваецца такая сітуацыя, што больш дробныя праекты, якія могуць рэалізоўвацца мясцовымі органамі ўлады, могуць быць больш прахаднымі і эфектыўна рэалізаванымі», — адзначыў Уладзіслаў Шчэпаў.

Дыскутавалі падчас сустрэчы і наконт пытанняў, як прыцягваць прадпрымальнікаў, каму з іх аддаваць перавагу і як стварыць роўныя ўмовы для буйных і малых інвестараў. «Мы павінны знайсці такую прававую канструкцыю, такое прававое поле, якое змагло б прывабіць масавага інвестара і аблегчыла б работу з інвестарамі дзяржаўных органаў», — падкрэсліў Уладзіслаў Шчэпаў.

Па выніках сустрэчы распрацаваны рэкамендацыі, якія будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы парламенцкіх слуханняў на тэму «Прававыя і практычныя аспекты паляпшэння інвестыцыйнага клімату ў Рэспубліцы Беларусь». Яны запланаваны на восень гэтага года.

**Марыя ДАДАЛКА**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗА ЛЁСАМ ТАЙСКІХ ПАДЛЕТКАЎ СОЧЫЦЬ УВЕСЬ СВЕТ



У Тайландзе група ратавальнікаў знайшла жывымі падлеткаў ва ўзросце ад 11 да 16 гадоў з дзіцячай футбольнай каманды і іх 25-гадовага трэнера, зніклых у затопленай пячоры 23 чэрвеня. Пра гэта паведамляе брытанская The Telegraph. Як перадае выданне, паўтара тыдня таму 12 школьнікаў разам з трэнерам адправіліся ў пячорны комплекс Тхам Луанг, працягласць тунэляў якога дасягае некалькіх тысяч кіламетраў. З-за раптоўнай залевы частка падземнага перахода была затопленая, у выніку чаго школьнікі аказаліся заблакаванымі ў глыбіні комплексу. У Тайландзе запусцілі адну з самых маштабных выратавальных аперацый за ўсю гісторыю краіны. У ёй прыняло ўдзел больш за 1000 чалавек. Па звестках CNN, да пошукаў падлеткаў былі прыцягнутыя тайскія выратавальныя сілы, а таксама эксперты з ЗША, Кітая, Аўстраліі і Вялікабрытаніі. Аперацыя працягвалася больш за тыдзень, пакуль двум брытанскім дайверам Джону Волантэну і Рыку Стантану не ўдалося знайсці зніклую групу за чатыры кіламетры ад увахода ў пячору. Дзеці сядзелі ў сухой пячорнай камеры ў поўнай цемры, акружаныя вадой, і выглядалі на здзіўленне спакойнымі. Хоць каманду і знайшлі, вызваліць іх з палону будзе значна больш складана. Разглядаюцца некалькі планаў выратавання. Не выключана, што хлопчыкам прыйдзецца правесці ў замкнёнай прасторы чатыры месяцы — пакуль вада не спадзе сама.

### ЛОПЕС АБРАДОР УПЭЎНЕНА ПЕРАМОГ НА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА МЕКСІКІ

Яго падтрымалі 52,96 % тых, хто прагаласаваў, паведаміў Нацыянальны выбарчы інстытут. Андрэс Мануэль Лопес Абрадор, кандыдат ад кааліцыі левых сіл «Разам створым гісторыю», заручыўся падтрымкай больш як 24 млн выбаршчыкаў на выбарах прэзідэнта Мексікі, якія адбыліся 1 ліпеня. Інаўгурацыя абранага прэзідэнта намечана на 1 снежня, ён будзе кіраваць краінай да 2024 года. Абрадор мае намер забяспечыць мір на пераходны перыяд паміж старым і новым урадамі краіны. Аб гэтым ён заявіў пасля сустрэчы з дзеючым прэзідэнтам Энрыке Пеньем Ньетам. На сустрэчы размова ішла пра перамовы па НАФТА, аб новым аэрапорце Мехіка, энергетычнай рэформе, бюджэце, бяспецы. Акрамя таго, пераможца выбараў дадаў, што мае намер урэзаць узровень заробкаў дзяржаўных службоўцаў, пачынаючы з сябе. «Я буду атрымліваць менш за палову таго, што атрымлівае дзеючы прэзідэнт Пенья Ньета, без якіх-небудзь кампенсацый», — расказаў Абрадор. Па звестках за 2017 год, кіраўнік Мексікі атрымліваў 13,8 тысячы долараў у месяц.



### BANK OF AMERICA ПАПЯРЭДЗІЎ ПРА МАГЧЫМЫ ПАЎТОР СУСВЕТНАГА КРЫЗІСУ

Аналітыкі Bank of America Corp. лічаць, што актуальная дынаміка на сусветным фондавым рынку падобная на тую, што была перад сусветным эканамічным крызісам у 1997—1998 гадах. Пра гэта паведамляе Bloomberg са спасылкай на спецыялістаў фінансавай арганізацыі. Пасля аналізу рынкавых трэндаў аналітыкі прыйшлі да высновы, што ў хуткім часе могуць паўтарыцца падзеі 1998 года, калі ў азіяцкім рэгіёне адбыўся эканамічны крызіс, а ў Расіі — дэфолт. Па звестках банка, моцны долар аказвае ціск на рынкі, якія развіваюцца. «Устойлівы рост у ЗША, згладжванне крывой прыбытковасці аблігацый — усё гэта падобна на рэха падзей 20-гадовай даўніны», — рэзюмаваў вядучы інвестыцыйны аналітык Bank of America Майкл Хартнет.

■ З нагоды

# ПАДАРУНКІ ДА СВЯТА

## У Магілёве адзначылі Дзень горада

**Прыемным падарункам для магілёўчан стала адкрыццё пасля капітальнага рамонту тэрапеўтычнага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы № 1. На гэта з гарадскога бюджэту было накіравана каля аднаго мільёна рублёў.**

Аддзяленне атрымала новае аблічча, але ў Магілёве ёсць яшчэ некалькі медыцынскіх аб'ектаў, дзе рамонтныя работы працягваюцца.

— Сёлета на медыцыну накіравана 26 % гарадскога бюджэту. Вядуцца рэканструкцыя гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, рамонт лячэбна-дыягнастычнага корпуса гарадской бальніцы, будаўніцтва памяшкання для ўстаноўкі МРТ, — адзначыў **мэр Магілёва Уладзімір ЦУМАРАЎ.**

Акрамя гэтага, у мэтах паляпшэння абслугоўвання магілёўчан гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі ўручаны тры рэанімабілі.

Святочным мерапрыемствам у Магілёве крыху перашкаджаў дождж, але самых стойкіх ён не спалохаў. Удзел у мерапрыемствах прынялі замежныя дэлегацыі, шматлікія госці.

Цудоўны падарунак зрабіла гораду магілёўская мастачка Вера Юркова. На сцяне этнаграфічнага музея з'явіўся яе гістарычны роспіс «Гараджане». Галоўная ідэя праекта — паказаць, якой цікавай была архітэктура старажытнага Магілёва і прыгожымі — яго жыхары.

Праліўны дождж не перашкодзіў адкрыццю зоркі яшчэ аднаго знакамітага ўраджэнца Магілёўшчыны, вернага сябра і мецэната абласнога цэнтра Валерыя Казакова. Яму таксама прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Магілёва. Наколькі гэта важная для яго адзнака, а таксама, якім справам ён сябе сёння прысвячае і чым збіраецца парадаваць сваіх землякоў, чытайце ў наступных нумарах «Звязды».

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**
**по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства**
**16 августа 2018 г. в 14.00**

**Лот № 1:** капитальное строение с инв.№ 720/С-14912, общая площадь 30,0 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный гараж с погребом, расположенный по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, район «Белый ручей», № 45-Л.

**Начальная цена снижена на 50 %:** 2 754 бел. руб. 00 коп., **задаток** – 275 бел. руб. 40 коп.

**Организатор аукциона:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения аукциона:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1 к. 203 УП «Могилевское отделение БелТПП».

**Лот № 1** продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе, внесли в установленном порядке задаток, который перечисляется на расчетный счет УП «Могилевское отделение БелТПП» в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 300, г. Могилев, ул. Первомайская, 63, IBAN: BY55PJCB30123018571000000933 BIC: PJCBBY2X, ОКПО 029450067000, УНП 700016628.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта недвижимого имущества осуществляется не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**Кроме того, победителем аукциона (покупателем) уплачиваются затраты на организацию и проведение аукциона.**

Аукцион состоится 16 августа 2018 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203.

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 15 августа 2018 г. до 12.00.

Регистрация участников аукциона состоится 16 августа 2018 г. с 13.15 до 13.45 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104.

Телефон для справок: (0222) 778042, 778041, (029) 6927492 (Velcom). Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: www.mogilevcci.by



ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» **(организатор аукциона)** информирует об ошибочно указанной начальной цене, задатке лотов. Новая начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб., с понижением начальной стоимости на 80 % составляет: № 1 – 147,07 бел. руб. (задаток – 14,71 бел. руб.), № 2 – 234,28 бел. руб. (задаток – 23,43 бел. руб.), № 3 – 24,13 бел. руб. (задаток – 2,41 бел. руб.), № 4 – 27,34 бел. руб. (задаток – 2,73 бел. руб.), № 5 – 36,56 бел. руб. (задаток – 3,66 бел. руб.), № 6 – 94,21 бел. руб. (задаток – 9,42 бел. руб.), № 7 – 154,60 бел. руб. (задаток – 15,46 бел. руб.), № 8 – 16,16 бел. руб. (задаток – 1,62 бел. руб.), № 9 – 556,30 бел. руб. (задаток – 55,63 бел. руб.), № 10 – 1 229,33 бел. руб. (задаток – 122,93 бел. руб.), № 11 – 917,16 бел. руб. (задаток – 91,72 бел. руб.), в аукционе, назначенного на **06.07.2018 г.,** имущества **Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»»** (продавец), согласно извещению **от 16.06.2018 г.** в газете «Звязда». Дата, место, время проведения аукциона согласно публикации от 16.06.2018 в газете «Звязда» № 114 (28730).

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» **(организатор аукциона)** информирует об ошибочно указанной начальной цене, задатке лотов. Новая начальная цена продажи имущества, **без учета НДС (20 %)**, бел. руб. составляет: № 1 – 441,82 бел. руб. (задаток – 44,18 бел. руб.), № 2 – 441,82 бел. руб. (задаток – 44,18 бел. руб.), № 3 – 441,82 бел. руб. (задаток – 44,18 бел. руб.). Новая начальная цена продажи имущества, **с учетом НДС (20 %)**, бел. руб. составляет: № 4 – 3 515,03 бел. руб. (задаток – 351,50 бел. руб.), № 5 – 1 959,60 бел. руб. (задаток – 195,96 бел. руб.), № 6 – 1 047,04 бел. руб. (задаток – 104,70 бел. руб.), в аукционе, назначенного на **19.07.2018 г.** имущества **Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»»** (продавец), согласно извещению **от 16.06.2018 г.** в газете «Звязда». Дата, место, время проведения аукциона согласно публикации от 16.06.2018 в газете «Звязда» № 114 (28730)

УНП 490321730



**Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что 24 июля 2018 года в 12.00**

**по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** состоится **повторный аукцион** по продаже земельного участка **У-460 микрорайон «Заболоть» в частную собственность** для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома с кадастровым номером **440100000002008339** площадью **0,0999 га**.

Начальная цена продажи: **12 599,41 рублей,** сумма задатка – **2 300 рублей.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **по 18 июля 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 742095, 720546.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594

■ Падрабязнасці

# БЕЛАРУСКА ЎЧАДЗЕЛА Ў ЛЬВОВЕ

**Трагічная вестка прыйшла з Украіны. 2 ліпеня ў Львове памерла 22-гадовая беларуска, якая прыехала ў горад у якасці турысткі. Цела дзяўчыны знайшлі ў ванным пакоі здымнай кватэры. Яна вырашыла памыцца, уключыла газавую калонку і задыхнулася.**

У другім пакоі ратавальнікі адшукалі 21-гадовага хлопца, з якім дзяўчына і здымала жыллё. Менавіта ён і выклікаў «хуткую дапамогу», перш чым страціць прытомнасць. Ён быў шпіталізаваны ў адну з львоўскіх бальніц. Урачы дыягнаставалі атручэнне чадным газам. Па звестках Галоўнага ўпраўлення нацыянальнай паліцыі Львоўскай вобласці, папярэдне гэтая ж прычына разглядаецца датычна смерці дзяўчыны.

Хоць газавыя калонкі і здаюцца на першы погляд анахранізмам як мінімум паўвекавой даўніны, але ў састарэлым жылым фондзе, дзе адсутнічае цэнтралізаванае гарачае водазабеспячэнне, яны сустракаюцца і дагэтуль. Таму Міністэрства энергетыкі нагадвае асноўныя правілы карыстання гэтымі прыборамі.

Перад кожным выкарыстаннем газавых воданагравальнікаў правярайце цягу ў пакоі. Воданагравальнікі працуюць толькі пры пэўным ціску вады. Калі ён зніжаецца, то гарэлка калонкі аўтаматычна гасне. У такім выпадку трэба тут жа закрыць усе краны і пачакаць, пакуль нармальны ціск не адновіцца. Выконваць элементарныя правілы бяспекі жыццёва неабходна. Няважна дзе — у сваім доме ці ў апартаментах, якія зняў на суткі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



## «Наталі Турс» абяцае кампенсацыю

**Буйны расійскі тураператар «Наталі Турс» (праз якога заказваюць пуцёўкі ў Турцыю, Грэцыю, Іспанію, Балгарыю, Егіпет і многія нашы падарожнікі) анулюе ўсе заказы з 4 ліпеня да 30 верасня 2018 года ўключна.**

«У сувязі з неспрыяльным развіццём сітуацыі, якая склалася на гэты момант з прымаючымі партнёрамі, вымушаны праінфармаваць, што кампанія не можа гарантаваць забеспячэнне выканання абавязкаў па турыстычных паездках у цяперашні час, — сказана на сайце аператара. — Аперацыйная дзейнасць ажыццяўляецца ў працоўным рэжыме».

Прэзідэнт кампаніі Уладзімір Вараб'ёў запэўнівае, што з 5 ліпеня яны прапануюць кліентам механізмы кампенсацыі (у тым ліку і неграшовыя).

— Мы працуем над тым, каб усе турысты, якія трапілі ў гэту сітуацыю, так ці інакш атрымалі ад нас кампенсацыю ў поўным аб'ёме, — перадае яго словы агенцтва ТАСС.

Тым, хто захоча скарыстацца іншым адпачынкам, выдадуць пуцёўку ўзамен аплачанай. Іншым давядзецца чакаць, пакуль у кампаніі нармалізуецца фінансавая сітуацыя і з'явіцца магчымасць адпраўляць турыстаў па бягучых праграмах, не падвяргаючы іх рызыцы. Уладзімір Вараб'ёў растлумачыў, што тураператар некалькі тыдняў таму сутыкнуўся з крызісам ліквіднасці — стала не хапаць сродкаў для разліку з партнёрамі ■

■ Турысту на заметку

# БЕЗ ПУЦЁЎКІ І БЕЗ ГРОШАЙ

### Як не трапіць у такую сітуацыю, расказвае Мінспорту і турызму

**На пачатку тыдня ў беларускіх турыстаў былі сур'ёзныя складанасці з вылетам з Кіева. Былі адменены рэйсы ў Туніс, Шарм-эль-Шэйх, Алікантэ, Люблін, Тырану, затрымліваліся вылеты ў Анталію і Батумі. Справа датычылася авіякампаній BravoAirways і AndaAir. Як растлумачылі ў першай з іх, рэйсы давялося адмяніць, бо тураператар OASIS на працягу двух гадоў не выконваў перад ёй свае фінансавыя абавязкі і меў запазычанасць у 950 тысяч долараў.**

**Беларусам, якія трапілі ў гэту непрыемную сітуацыю, аказваюць садзейнічанне. А тым, хто толькі збіраецца ў адпачынак, Міністэрства спорту і турызму дае парады, як засцерагчыся ад падобных інцыдэнтаў.**

Уважліва чытайце дагавор. Дагавор аказання турыстычных паслуг складаецца ў адпаведнасці з устаноўленай заканадаўствам тыпавой формай. Для іншых відаў паслуг тыпавая форма не прадугледжана.

**Перад зваротам у турфірму варта азнаёміцца з інфармацыяй пра яе ў адкрытых крыніцах: перш-наперш, ці існуе такая кампанія ўвогуле? Звесткі можна атрымаць на афіцыйным сайце Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў www.egr.gov.by. Не лішнім будзе праверыць звесткі пра фірму ў рэестры суб'ектаў турыстычнай дзейнасці, які вядзе дэпартамент па турызме міністэрства, — http://mst.by/ru/tourists-belarus-ru/ Гэту інфармацыю можна таксама атрымаць, патэлефанаваўшы ў дэпартамент па нумары 8 017 327 23 25. На пытанні адкажа галоўны юрысконсульт аддзела маркетынгу і якасці турыстычных паслуг Аляксандр Крэчатаў.**

Незалежна ад таго, набываеце вы пуцёўку ці заказваеце толькі браніраванне, кансультаванне, візавую падтрымку, дагавор на гэта трэба заключыць у пісьмовай форме. Выключэнне — выпадкі, звязаныя з перавозкай ці размяшчэннем, дзе пацвярджэннем дагавора лічацца білеты або дакументы на засяленне (ваўчар, напрыклад). Але калі паслугі перавозкі і размяшчэння набываюцца ў комплексе з іншымі, то абавязкова патрэбна заключэнне дагавора з наступнай выдачай дакументаў для перавозкі і пражывання.

Перш чым ставіць свой подпіс, праверце наяўнасць наступных раздзелаў: кошт паслуг, тэрмін і парадак іх аплаты, правы і абавязкі бакоў, звесткі аб выканаўцы, заказчыку і трэціх асобах, для якіх набываюцца паслугі, праграма падарожжа. Аплата праводзіцца так, як прапісана ў дагаворы, яе факт павінен пацвярджацца касавым чэкам ці іншым плацежным дакументам. Яго абавязаны вам выдаць: гэта прадугледжвае закон «Аб абароне правоў спажыўцоў».

Калі фірма дапамагае вам афармляць візу, яна мусіць пракансультаваць вас, як правільна запаўняць дакументы, і папярэдзіць пра прычыны, з-за якіх могуць адмовіць адкрыць візу.

Арыгіналы дакументаў, неабходных для аказання турпаслуг, а таксама валюту для аплаты збору пры аказанні візавай падтрымкі перадаюць па акце аб прыёме-перадачы дакументаў, які складаецца ў двух экзэмплярах. Адзін кампанія пакідае сабе, другі аддае вам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ** ■

■ Наш фармат

# Кёрлінг, снег і 1,5 тоны марожанага

### У сталіцы адзначылі юбілей беларускага пламбіру

**Нягледзячы на тое, што доўгія выхадныя выдаліся даволі халодныя і дажджлівыя, свята дня нараджэння айчыннага марожанага сабрала мноства гасцей і ўдзельнікаў. Як адзначылі арганізатары, 15 тысяч наведвальнікаў атрымалі адмысловыя беларускамоўныя пашпарты грамадзян «Краіны марозіва», а за 6 гадзін фестывалю было з'едзена паўтары тоны нарыхтаванага загадзя ласунку.**

Тэматычны парк забаў «Краіна марозіва» разгарнуўся на адзін дзень у наваколлі «Мінск-Арэны». Дарэчы, гасцямі яго сталі не толькі жыхары сталіцы. Пра гэта яскрава сведчыла спецыяльна ўсталяваная 3-метровая карта Беларусі: на якой, дзе кожны ахвотны мог звязаць каляровымі стужкамі Мінск і свой родны горад ці малую радзіму сваіх бацькоў, акрамя беларускіх гарадоў і вёсак, з'явіліся Ніжні Ноўгарад, Варкута і нават Нью-Ёрк...



Адгукнуліся наведвальнікі і на прапанову арганізатараў не толькі пакаштаваць эка-марожанае (лімітаваная серыя «Белага полюса 1938» зроблена па аўтэнтычным рэцэпце без «Е» сярод складнікаў), але і скарыстацца эка-транспартам. Так, на фэст завітала больш за 1000 веласіпедыстаў і скейтараў, кожны з якіх у якасці заахвочвання атрымаў пачак пламбіру «Белы полюс». Што цікава, дарослыя пераважна выбіралі эскімо, а маленькія госці — вафельныя кубачкі. Карысталіся попытам і іншыя гатункі марожанага і малочныя кактэйлі з яго, а таксама... дранікі з марожаным, якія замаўлялі так часта, што ў сярэдзіне дня спатрэбілася дадатковая завозіць бульбу.

Ну, а непасрэдна на святочных пляцоўках кожны выбіраў сабе занятак для душы: малеча з задавальненнем гуляла ў канструктары і лялькі, каталася на стылізаванай надзіманай снежнай горцы і «ўзыходзіла» на самую сапраўдную — пад вечар ад двухметровай горкі, на якой фатаграфаваліся і гулялі ў снежкі цэлымі сем'ямі, застаўся толькі сціплы ўзгорак. Акрамя таго, дзеці розных узростаў ахвотна ўдзельнічалі ў заездах на бегавелах і веласіпедах, скачках на батутах, квэстах і творчых майстар-класах. Дарослыя з не меншым імпэтам спаборнічалі ў кёрлінгу, настольным тэнісе, адкрытых уроках танцаў, падпявалі выступоўцам падчас вялікага музычнага марафону. А ўвечары тыя, хто загадзя прайшоў рэгістрацыю ў арганізатараў і меў з сабой канькі, змаглі трапіць на галоўны каток краіны, дзе звычайна трэніруюцца толькі прафесійныя спартсмены.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

# Ніводнага прахаднога матча

### Заўтра стартуе чвэрцьфінальная серыя чэмпіянату свету

**У аўторак вызначыліся апошнія каманды, якія працягнуць гульню на расійскім мундзіялі. Матчы атрымаліся асабліва знакавыя для пераможцаў і драматычныя для тых, хто прайграў.**

Зборная Швецыі абыграла швейцарцаў з лікам 1:0, на 66-й хвіліне Эміль Петэр Форсберг моцна прабіў з 18 метраў, мяч рыкашэтам ад абаронцы ўляцеў у сетку варот. У швейцарцаў былі магчымасці адыграцца, але рэалізаваць іх ім так і не ўдалося. Такім чынам, упершыню з 1994 года шведы выйшлі ў чвэрцьфінал чэмпіянату свету. Там скандынавы сустрэнуцца з англічанамі, якія сталі апошнімі ўладальнікамі пуцёўкі ў 1/4.

Іх матч супраць зборнай Калумбіі зацягнуўся. У пачатку другога тайма ў вароты калумбійцаў быў прызначаны пенальці за парушэнне правілаў супраць найлепшага бамбардзіра цяперашняга чэмпіянату Хары Кейна. Сам футбаліст і рэалізаваў 11-метровы, забіўшы свой шосты гол на турніры. Усё ішло да перамогі англічан, аднак на 3-й хвіліне дабаўленага часу Еры Міна зраўняў лік (1:1). У дадатковыя паўгадзіны пераможца не вызначыўся, а ў серыі пасляматчавых пенальці ўдача была на баку Англіі — 4:3. Адзначым, што англічане ўпершыню атрымалі перамогу ў серыі пенальці на чэмпіянатах свету. Да гэтага зборная Англіі тройчы ўдзельнічала ў серыях адзінаццаціметровых удараў і кожны раз прайгравала.

Акрамя пары Англія — Швецыя, у 1/4 згуляюць Уругвай — з Францыяй, Бельгія — з Бразіліяй, а Расія — з Харватыяй. Чвэрцьфінальны матч з удзелам гаспадароў чэмпіянату плануюць наведаць каля 10 000 балельшчыкаў з Харватыі. *«Цікавасць у Харватыі да чэмпіянату свету ў Расіі велізарная. Актыўна хвалюецца за сваіх і харвацкая дыяспара. Людзі едуць у Расію не толькі з самой Харватыі, але і з Германіі, іншых краін Еўропы і нават з Аўстраліі»,* — расказаў кіраўнік прадстаўніцтва па турызме Харватыі ў Расіі Райка Ружычка.



rsport.ria.ru

**Расклад гульняў:**

*6 ліпеня, пятніца*

17.00 (па беларускім часе) — Уругвай — Францыя

21.00 — Бразілія — Бельгія

*7 ліпеня, субота*

17.00 — Швецыя — Англія

21.00 — Расія — Харватыя

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Новыя кнігі

# СТО ВЕРШАЎ: МАЯ МАЛАЯ РАДЗІМА

**Зямля бацькоў, святая... : зборнік вершаў пра малую радзіму / уклад. Віктара Шніпа. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2018. — 143 с. — (100 вершаў).**

Паэтычная серыя «100 вершаў» толькі пачынае сваё жыццё. Выйшлі кнігі Міхася Стральцова, Пімена Панчанкі. І вось да чытача прыйшоў новы зборнік. Гэтым разам — калектыўны. Пад адной вокладкай — вершы беларускіх мастакоў слова розных пакаленняў: Канстанцы Буйло («Люблю наш край, старонку гэту...»), Петруся Броўкі («Родныя словы»), Максіма Танка («Вёска мая»), Пімена Панчанкі («Зямля бацькоў»), Уладзіміра Караткевіча («Беларуская песня»)... А яшчэ — творы Анатоля Вярцінскага, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка, Янкі Сіпакова, Уладзіміра Карызны, Міколы Маляўкі, Мар'яна Дуксы, Казіміра Камейшы, Віктара Гардзея, Раісы Баравіковай...

У вершах — сапраўдныя адрасы малой радзімы, літаратурная геаграфія беларускага краю. Хоць і піша, напрыклад, Алесь Бадак пра край свету, усё ж паэт знаходзіцца «на сцежцы палявой, / З якой відаць уся мая Айчына». І без свайго роднага кута любові і журбы паэт «у свеце заблудзіўся». Цеплыня паэтычных радкоў, бы чыстая крынічная вада, працінае, ўсё сэрца, кранае душу, кожнага з чытачоў вяртае да родных вытокаў, да родных сялібаў.

Прымеркаваны да Года малой радзімы зборнік вершаў «Зямля бацькоў, святая...» багаты і на рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў — Аркадзя Астаповіча, Апалінара Гараўскага, Вітольда Бяльніцкага-Бірулі, Вячаслава Кубарава, Пятра Данеліі, Барыса Аракчэева, Меера Аксельрода, Леаніда Шчамялёва.

**Мікола БЕРЛЕЖ** ■

# Што вінен, аддаць павінен

## Аддаў даўгі — вярні правы

Год назад у краіне ўступілі ў сілу два законы: «Аб судовых выканаўцах» і «Аб прымусовым выкананні». Дакументы пашырылі шэраг паўнамоцтваў судовых выканаўцаў, распісалі іх больш дэталёва і вызначылі парадак дзеяння ў гэтых асоб. Выканаўчае вядзенне запрацавала па заяўным прынцыпе — спагнаннік атрымаў магчымасць самастойна звяртацца ў адпаведныя інстанцыі з патрабаваннем вярнуць даўгі. Аднак практыка паказала, што законы ўсё роўна маюць некаторыя нюансы.

— Абмежаваць даўжніка ў правах, у прынцыпе, даволі проста і не патрабуе шмат часу. Калі ж чалавек свае абавязкі выканаў, трэба яму гэтыя правы вярнуць. Аднак гэта немагчыма зрабіць адразу. Спатрэбіцца тыя ж некалькі тыдняў, як і тады, калі суд прымаў рашэнне аб абмежаванні, — расказаў галоўны судовы выканаўца. — Да таго ж у даўжніка можа быць некалькі розных запазычанасцяў. Ён адну пагасіў, а іншая засталася. Мяркую, што даўжнік непасрэдна зацікаўлены ў тым, каб звярнуцца з хадайніцтвам аб адмене абмежаванняў, калі ён свае абавязкі выканаў.

Даўгі не ўзнікаюць знянацку, і, як правіла, людзі пра іх ведаюць: няхай гэта будзе выканаўчы надпіс натарыуса за запазычанасць па паслугах ЖКГ ці неаплачаны штраф ДАІ. Аднак бывае, што чалавек і не здагадваецца пра запазычанасць і не ведае, што ўнесены ў адзіны рэестр даўжнікоў. Часцей за ўсё гэта здараецца праз сістэму фотафіксацыі. Людзі не атрымліваюць лісты аб зафіксаваных парушэннях на дарозе, бо жывуць не ў тым месцы, дзе зарэгістраваны, іх мабільныя тэлефоны запісаны не на іх імя, электронныя скрыні мяняюцца...

— Было б добра знайсці нейкія аператыўныя сродкі інфармавання даўжнікоў аб іх статусе, аднак пакуль такога ўніверсальнага спосабу няма. Мы мяркуем прасіць у заяўнікаў, якія будуць звяртацца да нас, каб яны пакідалі сродак для зваротнай сувязі з імі. Сёння заяўнік патрабуе запазычанасць, а заўтра ён сам можа стаць даўжніком. З часам мы збяром нейкі інфармацыйны блок, які дазволіць нам мець сувязь з такімі суб'ектамі, — спадзяецца спецыяліст.

## Абмежаваць нельга адмовіць

Суды заўжды ацэньваюць, каго і як абмяжоўваць у правах, ці будзе пэўная мера ўплываць на канкрэтнага даўжніка. Забарона на перасячэнне мяжы будзе больш дзейснай для тых, хто жыве недалёка ад яе ці ездзіць на адпачынак ды ў шоп-туры за мяжу. Суддзі могуць, дарэчы, і адмовіць у патрабаванні абмежавання як заяўніку, так і судоваму выканаўцу.

Як правіла, заяўнікі звяртаюцца дзеля спагнання грошай (як з фізічных асоб, так і з прадпрыемстваў). Калі іх няма — шукаюць маёмасць даўжніка, займаюцца яе вопісам па месцы жыхарства. Дзмітрый Каваленка тлумачыць:

— Забеспячальныя меры ці абмежаванні павінны быць суразмернымі памерам сумы доўгу і наступствам, якія яны могуць з сабой прынесці. Часам спагнаннікі скардзяцца, што іх хадайніцтва па абмежаванні правоў даўжніка суд не задаволіў. Аднак заяўнікам трэба ўзвешваць свае патрабаванні і сумы запазычанасці. Калі доўг 20 рублёў, то няяк няправільна казаць пра абмежаванне спецправоў. Можна запатрабаваць, скажам, апісаць усю маёмасць прадпрыемства, спынііўшы тым самым яго дзейнасць. А як яно тады будзе зарабляць, каб даўгі пакрыць? Ці, напрыклад, даўжнік — таксіст. Як ён можа вярнуць доўг, калі яго пазбавіць сродку заробку, абмежаваўшы ў праве кіравання аўто?

Аднак праз удасканаленне закона цяпер, калі судовы выканаўца арыштаваў маёмасць прадпрыемства, нават калі яно заявіла пра сваю ліквідацыю, зрабіць гэта яму дазволяць толькі пасля продажу маёмасці. І выключаць прадпрыемства з Адзінага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

## Відэарэгістратар і медыятар

Судовы выканаўца можа запатрабаваць у даўжніка звесткі аб яго даходах і маёмасці, і чалавек абавязаны прадставіць гэты дакумент.

— Гэта вельмі тонкая мяжа паміж нашай работай і недатыкальнасцю ўласнага жыцця і асабістых даных даўжніка. Прадстаўляць спагнанніку інфармацыю пра тага, хто яму вінен, трэба вельмі акуратна. Заяўнік жа ў сваю чаргу мусіць ведаць, што распаўсюджванне асабістых даных пра даўжніка — незаконнае, — разважае Дзмітрый Каваленка. — З іншага боку, у сацыяльных сетках можна знайсці інфармацыю пра даўжніка праз каментарыі людзей, якія яго ведаюць. Такія весткі нашы выканаўцы таксама аналізуюць, каб зразумець, чым ён насамрэч зарабляе і як падступіцца да яго маёмасці. Можна накіраваць спагнанне, напрыклад, і на сумесную маёмасць, набытую падчас шлюбу, і на долю даўжніка ў нейкай агульнай маёмасці.

Спагнаннік таксама можа дапамагчы судовым выканаўцам, падзяліўшыся фактамі пра даўжніка. Напрыклад, дапамагчы засведчыць і даказаць, што да суда ў даўжніка былі значныя сродкі і дарагія рэчы: аўто, дамы ці іншая маёмасць.

А вось пры аглядзе і арышце маёмасці даўжніка спагнаннік мае права прысутнічаць. Аднак правам не пускаць заяўніка ў кватэру валодае і даўжнік. Каб задаволіць абодва бакі і не быць абвінавачанымі ў змове з адным з іх, пры аглядзе кватэры судовыя выканаўцы выкарыстоўваюць відэарэгістратары. Гэта дазваляе мець відэазапіс з гукам у рэальным часе аргляду. А спагнаннік зможа праглядзець яго без права капіравання.

Да работы з канфліктамі паміж спагнаннікам і даўжніком плануюць далучаць і медыятараў, каб яны маглі наладзіць узаемадзеянне паміж варожымі бакамі. Пакуль магчымасць такога ўдзелу бачыцца ў немаёмасных спагнаннях. Напрыклад, калі вырашаецца пытанне аб удзеле бацькоў у выхаванні дзіцяці і знаходжанні яго пэўны час з адным з іх. Пры ўдзеле медыятара ў разглядзе такіх спрэчак многія справы проста не дайшлі б да суда, а скончыліся добраахвотнымі пагадненнямі, упэўнены спецыяліст.

— Звычайна ў такіх справах чыстыя эмоцыі, і пакуль не запрасіць псіхолага ці медыятара, вырашыць праблему немагчыма. Нават калі будзе рашэнне суда, бакі таксама могуць яго не выконваць, — разважае галоўны судовы выканаўца. — А думаць перш за ўсё трэба не пра выкананне, а пра псіхалогію дзіцяці. Пра тое, што будзе з малым у той час, калі ён знаходзіцца ў таго з бацькоў, хто не хоча ўдзельнічаць у яго жыцці.

## Гісторыя «хваробы» даўжніка ў базе

Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма прымусовага выканання («АІС ПВ») — таксама эфектыўны сродак работы з даўжнікамі, мяркуе спецыяліст. У праграму ўносяцца ўсе справы, з якімі працуюць судовыя выканаўцы, што дазваляе аператыўна адсочваць, у якой стадыі знаходзіцца пэўнае выкананне па ўсёй краіне.

— Гісторыя работы захоўваецца ў АІС ПВ і пасля выплаты доўгу. І калі запазычанасць узнікае ізноў, гэтая інфармацыя дазваляе лепш вырашаць, як працаваць з даўжніком. Гэта як картка гісторыі хваробы пацыента. Дапамагае аб'ектыўна зразумець, як хутка і пасля якіх мер ён аплаціў свае даўгі. Якое яго становішча цяпер, як даўгі ўзнікалі, ці прымяняліся да яго абмежаванні, ці не з'яўляецца ён адразу і спагнаннікам, і даўжніком, дзе ён мігрыруе па краіне, — заўважыў Дзмітрый Каваленка.

З мінулага года судовае выканаўства актыўна супрацоўнічае і з Нацыянальным банкам краіны. Фінансавая ўстанова сама правярае, дзе і якія рахункі ёсць у даўжніка, з якіх у залік доўгу можна спагнаць грошы. Судовы выканаўца можа накіраваць адпаведныя працоўныя дакументы тым, хто налічвае даўжніку грошы, і іх перавядуць не на зарплатную картку, а на дэпазітны рахунак органаў прымусовага выканання, каб пасля вярнуць спагнанніку.

— Калі памер доўгу да дзесяці базавых велічынь, выканаўчы ліст накіроўваецца на работу даўжніка, і бухгалтэрыя штомесяц утрымлівае з яго зарплаты нейкую частку, пакуль не пакрыецца ўся сума. Гэта і эканомія на перасылцы папяровых лістоў і паведамленняў, і аператыўнае атрыманне штрафаў за фотафіксацыю. Атрымліваецца работа ў рэжыме нон-стоп і павышэнне аператыўнасці, — дадаў спецыяліст. — Калі ж грошы вялікія, то акрамя ўтрымання з заробку судовы выканаўца працягне працаваць з маёмасцю даўжніка, апісваць яе і арыштоўваць.

Магчымасць аўтаматычна спісаць усю суму доўгу з зарплатнай карткі даўжніка таксама разглядаецца Мінюстам. Аднак пры гэтым будзе ўлічвацца, што гэта за сродкі ў даўжніка, каб не пазбавіць яго апошняга. З іншага боку, плануецца рэалізаваць магчымасць самім даўжнікам аплачваць свае даўгі з выкарыстаннем сістэмы «Разлік» (АРІП), прычым нават часткамі, а не адразу цалкам.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ШАГ НАВСТРЕЧУ ВЕСНЕ!»

shagovita

Результаты рекламной игры.

Организатор рекламной игры: ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

Рекламная игра называется «Шаг навстречу весне!».

Срок проведения рекламной игры: в период **с 1 апреля 2018 года по 9 июля 2018 года** (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: фирменные магазины ЗАО ТД «Шаговита», расположенные на территории Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3238 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 28 марта 2018 г.

В рекламной игре приняло участие 17 583 (семнадцать тысяч пятьсот восемьдесят три) физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

**Список победителей рекламной игры «Шаг навстречу весне!»**

| № п/п | Номер участника | ФИО победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|
| **Розыгрыш № 1** | | | |
| **Главный приз № 1** – Электросамокат Xiaomi MiJia Smart Electric Scooter Youth (Black) стоимостью 899, 00 бел. рублей + денежный приз в размере 116,10 бел. рублей | | | |
| 1 | 01564 | Журавкина Ирина Владимировна | г. Борисов |
| **Главный приз № 2** – Робот-пылесос iRobot Roomba 616, стоимостью 630,00 бел. рублей + денежный приз в размере 75,91 бел. рублей | | | |
| 2 | 05692 | Жемская Мария Викторовна | г. Брест |
| **Второстепенный приз** – Умные часы детские Smart Baby Watch Q80 (темно-синий) | | | |
| 3 | 14195 | Авдеенко Татьяна Михайловна | г. Могилев |
| 4 | 14295 | Микянец Анастасия Александровна | г. Лида |
| 5 | 14395 | Ванкевич Виталий Викторович | г. Борисов |
| 6 | 14495 | Монина Елена Валерьевна | г. Брест |
| 7 | 14595 | Горбарук Екатерина Ивановна | г. Брест |
| 8 | 14695 | Воронова Наталья Сергеевна | г. Витебск |
| 9 | 14795 | Курьянович Ольга Николаевна | г. Минск |
| 10 | 14895 | Бубер Александр Викторович | г. Минск |
| 11 | 14995 | Квачонок Константин Петрович | г. Витебск |
| **Розыгрыш № 2** | | | |
| **Главный приз № 1** – Игровая приставка Sony PlayStation 4 1TB + игра FIFA 18 (PS719933960) стоимостью 1037,30 бел. рублей + денежный приз в размере 136,77 бел. рублей | | | |
| 1 | 09108 | Пашкова Ольга Сергеевна | г. Ветка |
| **Главный приз № 2** – Домашний кинотеатр Sony BDV-E4100 стоимостью 848,48 бел. рубля + денежный приз в размере 108,55 бел. рубля | | | |
| 2 | 04016 | Николаюк Дмитрий Петрович | г. Брест |
| **Второстепенный приз** – Беспроводная колонка Mi Pocket Speaker 2 (черный) | | | |
| 3 | 14195 | Телицин Денис Андреевич | г. Минск |
| 4 | 14295 | Тарасов Евгений Юрьевич | г. Минск |
| 5 | 14395 | Рыбалка Любовь Сергеевна | г. Борисов |
| 6 | 14495 | Мамчиц Андрей Анатольевич | г. Копыль |
| 7 | 14595 | Василевская Надежда Викторовна | г. Витебск |
| 8 | 14695 | Шабашов Гарри Александрович | г. Могилёв |
| 9 | 14795 | Тиханович Людмила Владимировна | г. Витебск |
| 10 | 14895 | Карпович Елена Сергеевна | г. Калинковичи |
| 11 | 14995 | Шибкова Татьяна Владимировна | г. п Руба |
| **Розыгрыш № 3** | | | |
| **Главный приз № 1** – Планшет Lenovo Tab 4 10 TB-X304L 16GB LTE (ZA2K0054UA) стоимостью 503,10 бел. рубля + денежный приз в размере 56,95 бел. рубля | | | |
| 1 | 02485 | Дайнеко Татьяна Васильевна | г. Минск |
| **Главный приз № 2** – Набор бескаркасных кресел Flagman Груша, 4 шт.( Бес-каркасное кресло Flagman Груша Макси Г2.1-172 (красный/синий) – 2шт. + Бескаркасное кресло Flagman Груша Мега Г3.1-172 (красный/синий) – 2 шт.) стоимостью 387,00 бел. рублей + денежный приз в размере 39,60 бел. рубля | | | |
| 2 | 03116 | Таузендфрайнд Татьяна Владимировна | г. Брест |
| **Второстепенный приз** – Электрическая зубная щетка Braun Oral-B Vitality CrossAction / D12.513 | | | |
| 3 | 04834 | Железко Анастасия Владимировна | г. Минск |
| 4 | 04934 | Голубев Александр Васильевич | г. Могилев |
| 5 | 05034 | Забавская Галина Викторовна | г. Минск |
| 6 | 05134 | Чепелюк Сергей Викторович | г. Брест |
| 7 | 05234 | Наварай Александр Корнеевич | г. Пинск |
| 8 | 05334 | Бохан Елена Михайловна | п. Юбилейный |
| 9 | 05434 | Князев Валерий Евгеньевич | г. Витебск |
| 10 | 05534 | Василевская Мария Александровна | г. Новополоцк |
| 11 | 05634 | Клещенок Мария Владимировна | г. Минск |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: + 375 29 505 05 32 (в рабочие дни с 10:00 до 17:00)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15844)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

# Ганна БЯЛЯЕВА: «АД СЦЭНЫ АТРЫМЛІВАЮ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ»



**«Выпадковасці ў маім жыцці не выпадковыя!» Актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Ганна Бяляева ідзе па жыцці менавіта з такім дэвізам. Наша сустрэча адбылася ў яго сценах, таму атмасфера была не проста ўтульнай, а па-сапраўднаму творчай. Зрэшты, як і сама наша гераіня — дыпламант міжнароднага конкурсу, артыстка-вакалістка і не толькі...**

**— Вы нарадзіліся не ў Беларусі? Як трапілі сюды?**

— Я з Туркменіі, з горада Небід-Даг, што ў перакладзе азначае «нафтавая гара». У Беларусь мая сям'я пераехала, калі мне было пяць гадоў. Прыехалі сюды, бо тут былі карані па бацькавай лініі. Жыць вырашылі ў Гомелі, дзе я вучылася ў гімназіі № 56 і ў каледжы мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага. Пасля яго заканчэння пераехала ў Мінск, паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і ўжо тут «пусціла свае карані».

**— Памятаеце сваё першае выступленне?**

— Яно было ў дзесяць гадоў на навагоднім ранішніку на рабоце ў таты. Удзвюх з сястрой мы спелі песеньку пра Снягурку, якую чулі дома на пласцінцы. У нас заўсёды гучалі розныя песні і аўдыяказкі, якія і развілі мой музычны слых і творчую фантазію. На тым навагоднім ранішніку мяне пачула дзяўчына, якая параіла пайсці ў гурток харавых спеваў у гомельскі Палац піянераў. Так выпадковы чалавек паўплываў на мой далейшы лёс.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Прыёмная кампанія — 2018*

# Без права на памылку

## Чаму лепш не адкладваць наведванне прыёмнай камісіі на апошнія дні?



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**«Падлеткі скралі цвёрдыя дыскі з данымі АДЭ. Але там аказаліся спісы старшакласнікаў...», «У сацыяльных сетках абмяркоўваюць уцечку варыянтаў», «АДЭ: разбор палётаў», «Алжыр адключае інтэрнэт на час экзаменаў у школах» — падобнымі навінамі з «экзаменацыйнага фронту» СМІ стракацяць кожнае лета.**

### ЗА СПІСВАННЕ — У ТУРМУ

За сумленныя экзамены спрабуюць змагацца паўсюдна, прычым самымі рознымі спосабамі. Нават такімі радыкальнымі, як у Алжыры, дзе два гады таму з-за скандалу з уцечкай у інтэрнэт экзаменацыйных заданняў амаль палова вучняў была вымушана пераздаваць экзамен на атэстат аб сярэдняй адукацыі. У мінулым годзе ўлады звярнуліся да правайдараў з просьбай абмежаваць доступ да сацыяльных сетак падчас экзаменацыйнага перыяду, але гэтага аказалася недастаткова.

Улады не маглі далей пасіўна назіраць за тым, як інфармацыя аб экзаменацыйных пытаннях прасочваецца ў інтэрнэт, таму і пайшлі на яго адключэнне. Доступ да сеціва, у тым ліку і па мабільнай сувязі, было вырашана блакаваць пасля пачатку кожнага выпускнога экзамену ў сярэдніх школах, каб вучні не маглі падглядваць адказы і паведамляць іншым пра свае заданні.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ВЫШЫВАНАЧКА МАЯ!

**Напярэдадні Дня Незалежнасці ў сталіцы прайшла ўжо традыцыйная маладзёжная акцыя «Дзень вышыванкі». Каля Палаца спорту было шмат цікавостак: фуд-корт «Беларуская карчма», фотамайстэрня «Натхненне», літаратурная гасцёўня «Смак роднай мовы», выстаўка аграсядзіб «Запрашаем да нас», салон беларускага арнаменту «Родныя ўзоры»... І вядома, вышыванкі, якія былі паўсюль — і на адзенні, і на сцэне, і на вырабах народных майстроў.**

**— Арнамент, намаляваны на беларускім сцягу, — гэта злучальная нітка ўсіх пакаленняў, — адзначае Дзмітрый Варанюк, першы сакратар ЦК ГА «БРСМ» (менавіта гэта арганізацыя апякуецца акцыяй). — Сучасная моладзь з задавальненнем носіць адзенне з элементамі нацыянальнага арнаменту, а ўдзел у такіх мерапрыемствах сапраўды нас усіх аб'ядноўвае і вяртае да каранёў, нацыянальных традыцый, духоўнай культуры Беларусі. Таму што асновы ідэалогіі дзяржавы — гэта захаванне традыцый. Самае галоўнае — гэта шанаваць іх і быць разам.**





Фота БелТА.

# Без права на памылку



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Акрамя таго, усе прылады з доступам да інтэрнэту, якія належаць як вучням, так і выкладчыкам, забаронена ўносіць у дзве тысячы залаў, дзе праходзяць экзамены. Пры ўваходзе ў кожную ўстаноўлены металашукальнікі. А ў друкарнях, дзе размнажаюцца экзаменацыйныя білеты, устаноўлены глушыльнікі мабільных тэлефонаў і камеры назірання.

Вельмі сур'ёзна ставіцца да агульнадзяржаўнага экзамену — «гаакаа» — у Кітаі, паколькі той вызначае ўсё далейшае жыццё чалавека. Часта конкурс у многія ВНУ складае да 100 чалавек на месца! Традыцыйна экзамен праводзіцца ва ўсіх кітайскіх школах у адзін час. Школьнікам дазваляецца ўзяць з сабой толькі ручку, аловак, гумку, лінейку і цыркуль. Іспыты займаюць два дні. Раніцай першага 2,5 гадзіны адводзіцца на адказы на пытанні па літаратуры і кітайскай мове, а пасля абеду — па замежнай мове і матэматыцы. У другі дзень здаецца яшчэ адзін з абавязковых прадметаў, а таксама адзін з прадметаў на выбар, які залежыць ад выбранай вучнем ВНУ. Вынікі разлічвае камп'ютарная праграма — гэта робіцца для выключэння чалавечага фактару.

**А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна.**

За спісванне, якое прыраўнялі да крымінальнага злачынства, абітурыент можа атрымаць нават турэмны тэрмін. Але са спісваннем у Кітаі змагаюцца не толькі крымінальнай адказнасцю. У дні экзаменаў над цэнтрамі незалежнай ацэнкі лётаюць беспілотнікі, якія глушаць сотавую сувязь, а ў некаторых раёнах Кітая выпускнікам адзяваюць на галаву «капелюшы» з газет — краі газеты звісаюць з галавы з усіх бакоў і перашкаджаюць падглядваць у работы суседзяў.

## «МАЯКІ» ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

У нашай краіне ў экзаменацыйных аўдыторыях такія жарсці не кіпяць. Некалькі дзясяткаў выдаленых з экзамену з-за ўласнага глупства ці нахабства ў разлік не ідуць. Ну што можна сказаць пра абітурыента, у якіх тэлефон раптам звініць у кішэні падчас экзамену? Мала таго, што яны не здалі свой мабільнік на ўваходзе, дык яшчэ і гук забыліся адключыць...

А вось наконт зместу тэстаў традыцыйна разгараюцца спрэчкі. І калі раней матэрыялы ЦТ папракалі ў іх звышскладанасці, то цяпер часцей крытыкуюць за занадта спрошчаныя заданні. Як вынік — летась на некаторых спецыяльнасці прахадныя балы выраслі на 50—80 пунктаў!

Новыя рэкорды ўстанавілі абітурыенты, якія паступалі на факультэт міжнародных адносін у БДУ, дзе на спецыяльнасцях «міжнароднае права» і «міжнародныя адносіны» прахадны бал склаў 384, а на спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» — 381.

Сур'ёзная канкурэнцыя назіралася таксама і на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Прахадныя балы па асобных спецыяльнасцях размеркаваліся наступным чынам: «прыкладная інфарматыка» (кірунак — «праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм») — 372, «інфарматыка» — 360, «актуарная матэматыка» — 352, «камп'ютарная бяспека» (кірунак — «матэматычныя метады і праграмныя сістэмы») — 352, «прыкладная матэматыка» — 341, «эканамічная кібернетыка» — 335.

У БДУІР у топе самых запатрабаваных сярод абітурыентаў спецыяльнасцяў аказаліся «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (прахадны бал 380), «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (371). Замкнула тройку лідараў па папулярнасці ў абітурыентаў спецыяльнасць «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» — прахадны бал 370.

Далей па папулярнасці ў абітурыентаў ідуць «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у бізнес-менеджменце)» — прахадны бал 363. Увогуле на кожную трэцюю спецыяльнасць для паступлення ў БДУІР трэба было мець больш як 350 балаў.

Ці варта абітурыентам 2018 года арыентавацца на мінулагоднія лічбы? Напэўна, так, няхай менавіта яны будуць для іх арыенцірам, бо, калі прахадныя балы раптам знізяцца, гэта стане прыемным сюрпрызам.

## КАМБІНАЦЫІ СЕРТЫФІКАТАЎ

Бадай што адной з галоўных навінак сёлетняй прыёмнай кампаніі з'яўляецца магчымасць падаваць у ВНУ сертыфікаты ЦТ мінулага года. Трэба заўважыць, што агульная колькасць удзельнікаў ЦТ зменшылася ў параўнанні з папярэднім годам больш чым на 10 тысяч чалавек. У той жа час колькасць выпускнікоў школ павялічылася на 500 чалавек. Ці азначае гэта, што моладзь нарэшце пераарыентавалася на прафесійна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную адукацыю? А можа быць, хтосьці вырашыў пашукаць сваю ўдачу з леташнімі сертыфікатамі? Калі абітурыенты будуць фарміраваць для прыёмнай камісіі пакет сваіх дакументаў, трэба мець на ўвазе, што сёлета былі скарэктаваны парогавыя значэнні па першым профільным прадмеце ўступных выпрабаванняў — яны павысіліся на 5 балаў. Былі скарэктаваны і ніжнія парогавыя значэнні для паступлення на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю і сілавога блока: мінімальны парог там цяпер складае 7 балаў.

Таксама ў прэтэндэнта на студэнцкі білет ёсць магчымасць выбраць з вынікаў здачы ЦТ за два гады сертыфікаты з лепшымі для сябе баламі і заявіць у прыёмную камісію, скажам, сертыфікат па хіміі за 2017 год, а па біялогіі за 2018 год. Ці выбраць лепшы сертыфікат ЦТ па дзяржаўнай мове.

А з мінулага года абітурыенты атрымалі яшчэ і магчымасць здачы не трох, а чатырох тэстаў, і яны ёй актыўна карыстаюцца. Сёлета амаль кожны другі абітурыент здаваў чатыры тэсты. У першую чаргу наяўнасць чацвёртага сертыфіката актуальная для тых спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на стыку галін ці прадметных абласцей.

## У БДУІРЫ ПЛЮС 300 МЕСЦАЎ

Трэба заўважыць, што колькасць месцаў для атрымання вышэйшай адукацыі ў гэтым годзе паменшылася. Так, прыём на дзённую бюджэтную форму навучання ў ВНУ будзе скарочаны на 1,8 працэнта, а на завочную бюджэтную — на 8 працэнтаў. Кантрольныя лічбы прыёму на платную форму навучання ў ВНУ зменшыліся на 19,1 працэнта ў параўнанні з 2017 годам. На ўсе формы навучання (і бюджэтную, і платную) плануецца прыняць 54,4 тысячы чалавек. Прыкладна на 10 працэнтаў скароціцца набор на юрыдычныя і эканамічныя спецыяльнасці. Адначасова павялічаны прыём на тэхнічныя і тэхніка-тэхналагічныя спецыяльнасці.

У БДУІРы амаль на 300 месцаў павялічваецца прыём на IT-спецыяльнасці, найбольш запатрабаваныя не толькі работадаўцамі, але і абітурыентамі. На факультэт камп'ютарных сістэм і сетак набор павялічыўся на 90 чалавек, на факультэт інфармацыйных тэхналогій і кіравання — на 110, на факультэт інфакамунікацый — на 60 чалавек. На тэхнічныя і эканамічныя спецыяльнасці лічбы прыёму засталіся без змяненняў.

Размеркаванне мінулага года, калі ў БДУІРы быў здвоены выпуск, і сёлетнія паказваюць, што попыт на маладых IT-спецыялістаў толькі ўзрастае.

Усяго на першую ступень навучання ў ВНУ плануецца прыняць каля 54,4 тысячы чалавек, у тым ліку за кошт бюджэту — 26,5 тысячы. Прымаць дакументы будзе 51 установа вышэйшай адукацыі, з якіх 42 дзяржаўнай формы ўласнасці і 9 прыватных. Скарачэнне аб'ёму падрыхтоўкі адбылося пераважна за кошт памяншэння лічбаў прыёму на завочную форму (поўны тэрмін навучання). Пры гэтым абітурыентам, якія скончылі ўстанову сярэдняй спецыяльнай адукацыі і пайшлі працаваць па спецыяльнасці, даецца магчымасць на падставе ўступных выпрабаванняў працягнуць навучанне ў завочнай форме ў скарочаныя тэрміны па інтэграваных вучэбных планах і праграмах.

## ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

Прыёмныя камісіі ВНУ распачнуць прыём дакументаў 12 ліпеня. Да 17 ліпеня з выбарам спецыяльнасці павінны вызначыцца ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

**Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 да 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).**

А з 18 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і для тых, хто на платнай аснове.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў з 26 да 28 ліпеня (залічэнне да 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 30 да 31 ліпеня (залічэнне да 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — з 30 ліпеня па 1 жніўня (залічэнне да 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: да 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, да 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.



**Будзь у курсе!**

**З любымі пытаннямі, што датычацца ўступнай кампаніі (падачы дакументаў, правядзення ўнутраных іспытаў, залічэння), абітурыенты могуць звярнуцца на гарачую лінію Міністэрства адукацыі (223-43-12) ці ў штаб Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў (327-66-80).**

## ГАЛОЎНАЕ — НЕ МІТУСІЦЦА!

Паколькі на падачу дакументаў на «бюджэт» даецца ўсяго шэсць дзён, абітурыентам трэба загадзя выбудаваць дакладную стратэгію дзеянняў. Адразу варта вызначыцца з профілем (магчыма, гэта будуць дзве-тры спецыяльнасці) і ўстановай адукацыі, куды хочацца паступіць. Падаваць дакументы лепш у першыя дні, бо калі разумнікаў цягнуць да апошняга акажацца шмат, то конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам. А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна: інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу.

У многіх ВНУ конкурс праводзіцца па групе спецыяльнасцяў з адзіным наборам уступных экзаменаў, што дазваляе абітурыентам адчуваць сябе больш спакойна. Але калі становіцца відаць, што шанцаў няма, трэба дзейнічаць. Ні ў якім выпадку не мітусіцца, а захоўваць моцныя нервы і ясную пазіцыю. Не варта шукаць шчасця ў іншых профілях, трэба спрабаваць паступіць па выбраным, на даўно ўпадабаную спецыяльнасць, магчыма, у іншым універсітэце, дзе меншы конкурс.

І вядома, не трэба забываць, што шлях да вышэйшай адукацыі адкрыты і пасля заканчэння прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ў пэўным сэнсе ён з'яўляецца нават больш лёгкім. Пасля каледжаў можна паступаць ва ўніверсітэты на скарочаны тэрмін навучання, не здаючы ЦТ па профільных прадметах, а толькі ўнутраныя экзамены па спецыяльнасці.

Месцаў ва ўстановах адукацыі хопіць на ўсіх абітурыентаў. Трэба толькі правільна падысці да прафесійнага выбару.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Школа жыцця*

# АДСЛУЖЫЦЬ ЯК ТРЭБА

## ДАПАМАГАЕ ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Больш як 150 спартыўна-патрыятычных лагераў, якія ахопяць 10 тысяч падлеткаў, будуць працаваць у нашай краіне падчас летніх канікул. Іх дзейнасць на базе воінскіх часцей арганізуецца па шэрагу напрамкаў: спартыўна-тэхнічным, фізкультурна-спартыўным, ваенна-патрыятычным, абаронна-спартыўным і іншых.**

Як расказаў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ**, усяго за апошнія дзесяць гадоў праз ваенна-патрыятычныя лагеры прайшлі больш як 120 тысяч беларускіх падлеткаў. Сумеснымі намаганнямі міністэрстваў абароны, адукацыі, БРСМ і Беларускага саюза афіцэраў штогод для навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца рэспубліканскі злёт абаронна-спартыўнага профілю, праводзіцца гульня «Зарніца». На базе злучэнняў і воінскіх часцей Узброеных Сіл праходзяць таксама спартыўна-патрыятычныя гульні «Бастыёны мужнасці» і «Арляня». Рэгулярна ў воінскіх часцях практыкуюцца дні адкрытых дзвярэй, дні прызыўніка і ўрокі мужнасці.

На папулярызацыю армейскай службы сярод школьнікаў скіраваны сайт «Дзецям аб арміі» — у яго 100 тысяч унікальных наведвальнікаў у год. Сёлета сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі быў праведзены конкурс, прысвечаны 100-годдзю Узброеных Сіл, у якім прынялі ўдзел амаль дзве тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак. Журы ацаніла больш як тысячу малюнкаў, каля 350 апавяданняў і 600 вершаў. Цікава, што сярод прызёраў і пераможцаў былі не толькі старшакласнікі, але і навучэнцы пачатковай школы, а самай юнай удзельніцы конкурсу споўнілася толькі сем гадоў.

У 2017 годзе Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам абароны і іншымі зацікаўленымі ведамствамі актуалізавала змест вучэбнай дысцыпліны «Дапрызыўная падрыхтоўка». У прыватнасці, цяпер прадугледжваецца вывучэнне старшакласнікамі сучаснай ваеннай палітычнай абстаноўкі, канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь. Але галоўнае — патрыятычнае выхаванне і маральна-псіхалагічная гатоўнасць юнакоў да ваеннай службы. Зараз рыхтуецца новы вучэбны дапаможнік па дапрызыўнай падрыхтоўцы.

У мэтах павышэння матывацыі да ваеннай службы і прафарыентацыі ўсе навучэнцы замацаваныя за воінскімі часцямі, установамі вышэйшай ваеннай адукацыі і арганізацыямі Узброеных Сіл. У найбліжэйшы час плануецца стварэнне рэспубліканскага метадычнага аб'яднання кіраўнікоў цэнтраў дапрызыўнай падрыхтоўкі з прыцягненнем да яго работы прадстаўнікоў Міністэрства абароны. Запланавана перадача ва ўстановы адукацыі і цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі макетаў зброі АК-74, тапаграфічных картаў, камплектаў агульнавайсковых статутаў Узброеных Сіл. Распрацоўваецца пытанне наладжвання ўзаемадзеяння цэнтраў з рэгіянальнымі арганізацыямі ДТСААФ па выкарыстанні іх матэрыяльна-тэхнічнай базы для правядзення вучэбных заняткаў па дапрызыўнай падрыхтоўцы. Усяго ў краіне дзейнічае каля 30 спецыялізаваных цэнтраў дапрызыўнай падрыхтоўкі, восем з іх — у Мінску.

Разам з тым, як канстатуе Уладзімір Макараў, у маладзёжным асяродку адбываецца прагматызацыя каштоўнасных арыенціраў. Калі ў 1967 годзе на вяршыні рэйтынга прафесій знаходзіліся касманаўты і ваенныя, то цяпер — праграмісты, урачы і бізнесмены. У мінулым годзе Цэнтрам псіхалагічных і сацыялагічных даследаванняў галоўнага ваеннага ведамства праводзілася даследаванне сярод выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў і маладых людзей, якія былі прызваны на службу ў армію. Яно паказала, што прафесія ваеннага знаходзіцца толькі на 11-м месцы ў рэйтынгу. Разам з тым у якасці кантрольнай групы ўзялі ваенна-патрыятычны клас, які функцыянуе ў бабруйскай СШ № 27. Высветлілася, што там амаль сто працэнтаў навучэнцаў маюць намер паступаць у навучальныя ўстановы сілавых ведамстваў.

Як зазначыў Уладзімір Макараў, у Беларусі самая вялікая колькасць падстаў для атрымання адтэрміноўкі ад службы ва Узброеных Сілах:

— Нам кажуць, што трэба зрабіць так, каб педагог-мужчына, які ідзе працаваць у сістэму адукацыі, меў ільготу і не служыў у арміі. Але я лічу, што жанчына-педагог, якая выхоўвае ў сваіх вучнях павагу да арміі, прынясе ў шмат разоў больш карысці, чым мужчына, які спецыяльна ідзе ў педагагічную ВНУ, каб не служыць у арміі. Так, школе насамрэч патрабуюцца педагогі-мужчыны, але ў класы да вучняў павінен прыйсці мужчына — абаронца Айчыны. Ці, напрыклад, прапануюць вызваляць ад тэрміновай вайсковай службы работнікаў аграпрамысловага комплексу. Маўляў, пасля арміі яны ўжо не жадаюць вяртацца на свае рабочыя месцы. Але, прабачце, ці армія вінаватая ў тым, што ў іх адсутнічае матывацыя для вяртання? Можа, трэба рабіць так, як гэта робіцца ў іншых краінах: спачатку маладыя людзі выконваюць перад радзімай свой воінскі абавязак, а ўжо потым ім даюцца льготы: па атрыманні адукацыі ці, напрыклад, па працаўладкаванні на дзяржслужбе... У Ізраілі абавязковая для ўсіх (і хлопцаў, і дзяўчат) служба ў арміі нікому яшчэ не перашкодзіла зрабіць кар'еру ў бізнесе, у навуцы, у культуры...

Між іншым, зараз у беларускай арміі служаць па кантракце пяць тысяч жанчын. І дзяўчаты зусім не супраць атрымання вышэйшай ваеннай адукацыі. Вось толькі месцы для іх выдзяляюцца рэдка і ў зусім невялікай колькасці. Дзяўчаты паступаюць у Ваенную акадэмію па асобным конкурсе і спаборнічаюць не з юнакамі, а паміж сабой. Прахадныя балы на месцы, што выдзяляюцца для асоб жаночага полу, могуць удвая і нават больш перавышаць прахадныя балы ў хлопцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Вучоба «ў полі»*

# Паспрабаваць сябе ў ролі прыродаахоўніка

**Падчас летніх канікул дзяржінспектары аховы жывёльнага і расліннага свету раскажуць падлеткам аб правілах прыродакарыстання. Прафілактычная работа з навучэнцамі актывізавалася ва ўсіх рэгіёнах.**



Так, пяты год запар супрацоўнікі Асіповіцкай інспекцыі запрашаюць дзяцей з ваенна-патрыятычнага лагера «Юнацтва». Амаль усе «экскурсанты» — ужо з вопытам рыбалоўства: ведаюць, што сеткамі лавіць нельга. Інспектары расказваюць, якія яшчэ прылады адносяцца да браканьерскіх (нераты, восці, пад'ёмнікі і г. д.) і калі нават звычайны спінінг можа аказацца пад забаронай (у нераст — з двума кручкамі).

**Намеснік начальніка інспекцыі Аляксандр САДОЎСКІ** ведае, як данесці важную інфармацыю да школьнікаў — гаварыць аб складаным трэба проста, «інакш пачнуць пазяхаць». Напрыклад, запомніць тэрмін вясенняй нераставай забароны дзецям будзе значна лягчэй, калі сказаць, што гэта два месяцы перад летнімі канікуламі. Пасля гутаркі кожны можа сесці за руль інспектарскага УАЗіка, лодкі або матацыкла, паглядзець у бінокль і выпрабаваць рацыю. А на памяць для хатняга чытання — буклеты Дзяржінспекцыі.

Аўдыторыя старэйшая і больш сур'ёзная — у дзяржінспектараў Гомельскай вобласці. Яны нядаўна правялі выязны занятак у перасоўным палатачным лагеры Гомельскага кадэцкага вучылішча, які размясціўся ў маляўнічым месцы каля вёскі Чкалава. Магчыма, сярод кадэтаў ёсць і будучыя інспектары аховы жывёльнага і расліннага свету. Паколькі гэтай прафесіі нідзе не вучаць, інспектары расказваюць падлеткам не толькі аб правілах, але і пра сваю работу, дэманструюць тэхніку і ўзбраенне.

За два летнія месяцы дзяржінспектары плануюць наведаць дзіцячыя аздараўленчыя ўстановы ў кожным раёне Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Будзем як вы!*

# З летнікаў — у госці да авіятараў

**Больш за сотню хлопчыкаў і дзяўчатак, якія адпачываюць у летніх аздараўленчых лагерах Пастаў і Пастаўскага раёна, наведалі нядаўна аэрадром «Азёры» дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай установы «Авіяцыя».**

Авіятары МНС пазнаёмілі дзяцей з будовай і прызначэннем верталётаў Мі-8 і AS-355NP, расказалі пра работу, якую выконвае выратавальная авіяцыя, а таксама далі магчымасць адчуць сябе ў ролі пілотаў і пасядзець за штурваламі вінтакрылых машын.

У канцы экскурсіі з дзецьмі правялі займальную віктарыну, расказаўшы пра тое, як паводзіць сябе ў надзвычайных сітуацыях і як іх не дапусціць, а таксама аб правілах бяспечных паводзін дома і на вуліцы.

Госці ўважліва слухалі работнікаў авіяцыйнага атрада і задавалі пытанні, якія іх цікавілі. А многія хлапчукі ўжо нават выказалі жаданне стаць ратавальнікамі ў будучыні. Вядома, пасля такой пазнавальнай экскурсіі!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 07 2018 г.

Пазнаёміцца з прафесіяй

# ПРАЦА НАД АБЛОКАМІ

## ПРАЎДА І МІФЫ ПРА СЦЮАРДЭС



**ЗАРАЗ, калі людзям даступны нават космас, для многіх, тым не менш, неба, паветраны транспарт па-ранейшаму застаюцца недасяжным «журавам» у адрозненне ад «сініцы ў руцэ» — аўтамабільнага ці чыгуначнага. Але ж ёсць і тыя, для каго неба стала прафесіяй. Сярод іх смалевічанка — бортправаднік паветраных суднаў авіякампаніі «Белавія» Ірына ДЗЯДЗЮЛЯ. Пра шлях да прафесіі, цяжкасці і арэол рамантыкі вакол яе — у нашай сённяшняй гутарцы.**

***— Ірына, раскажыце, калі ласка, як вы сталі сцюардэсай?***

— Мае маці і бацька амаль усё жыццё працуюць у Нацыянальным аэрапорце Мінск, толькі ў яго наземных службах. Мне з дзяцінства нярэдка даводзілася бываць тут і бачыць, як ідуць на пасадку і ўзлятаюць самалёты. Канешне, гэта заўсёды прываблівала, таму мара стаць бортправадніком паветранага судна не выглядала нелагічнай. Прынамсі, для бацькоў мой выбар не стаў нечаканасцю. Я скончыла Мінскі лінгвагуманітарны каледж, паступіла на завочнае аддзяленне лінгвістычнага ўніверсітэта і падчас навучання пачула пра набор бортправаднікоў у авіякампаніі «Белавія». Запоўніла анкету і падала рэзюмэ.

***— Так проста...***

— Не зусім. Проста было толькі запоўніць анкету. А вось быць прынятым... Усе прэтэндэнты праходзяць вельмі строгі адбор. Напрыклад, падчас майго паступлення з пяцідзесяці чалавек узялі толькі пятнаццаць.

***— Каб трапіць у лік абраных, абавязкова трэба мець мадэльную знешнасць?***

— Гэта, па-вашаму, высокі рост і параметры 90-60-90? Вось у мяне, напрыклад, дастаткова невысокі рост. Сцюардэсамі працуюць розныя дзяўчаты... Знешнія даныя, канешне, улічваюцца, але ж яны — не самае галоўнае. На першым месцы — здароўе. Тыя, хто марыць трапіць у гэтую прафесію, праходзяць сур'ёзную ўрачэбна-лётную эксперыментальную камісію — здаюць мноства аналізаў, ультрагукавых даследаванняў, псіхалагічнае тэсціраванне, стрэс-тэсты і гэтак далей... Таксама абавязковая ўмова — веданне англійскай мовы, а яшчэ лепей — некалькіх замежных...

Наша праца вельмі цяжкая і адказная, таму і на пенсію бортправаднікі выходзяць у 48 гадоў. Гэта ж вам не толькі ў прыгожым форменным адзенні прайсціся па салоне і прапанаваць напіткі і закускі. Шматгадзінныя пералёты на нагах, ненармаваны працоўны дзень, зменлівы графік палётаў... Інакш кажучы, ты выходзіш на працу ў любы час сутак. Адпаведна, трэба быць заўсёды да гэтага гатовым, здаровым, у добрым фізічным стане. Асноўная ж задача бортправадніка — гарантаваць бяспеку ў палёце. І падчас навучання на курсах мы старанна вывучаем аварыйна-выратавальнае абсталяванне самалёта, дзеянні ў аварыйных сітуацыях, прыёмы аказання медыцынскай дапамогі... Усё вельмі дакладна і скрупулёзна.

***— Ці здараліся ў практыцы экстрэмальныя выпадкі, калі спатрэбілася выкарыстаць атрыманыя ўменні?***

— Была сітуацыя, калі прыкладна шасцімесячнае дзіця нечым падавілася. І мне давялося ўзяць яго за ногі і вытрасаць прадмет, што затрымаўся ў дыхальным шляху. Можа, гэта і шакіруе некаторых чытачоў, але ж менавіта так аказваецца першая дапамога немаўляці ў падобных выпадках. На шчасце, я здолела яму дапамагчы і ўсё скончылася добра.

***— Нярэдка ў прэсе з'яўляюцца паведамленні пра паветраных дэбашыраў...***

— Так, здараецца. Напэўна, таму, што людзі баяцца лётаць, яшчэ на зямлі яны прымаюць нейкую колькасць «заспакаяльнага», інакш кажучы, алкаголю. І адпаведна, паводзяць сябе не зусім так, як трэба. У маёй практыцы падобнае здаралася неаднойчы. Добра, калі ў экіпажы ёсць мужчына-сцюард, але ж іх, на жаль, у кампаніі не так шмат. На шчасце, амаль заўсёды самі пасажыры дапамагаюць утаймаваць буйнага вандроўніка. І яшчэ. Перад палётам, па ўзгадненні з камандзірам паветранага судна, нецвярозага пасажыра мы маем права не дапусціць на борт.

***— А даводзілася вам сустракаць са знакамітасцямі ў самалёце?***

— Так. Сяргей Бязрукаў — часты кліент «Белавія», Вера Брэжнева, Іванушкі International... Такія пасажыры паводзяць сябе вельмі стрымана, імкнуцца не прыцягваць залішняй увагі.

***— Тым, хто бачыць вашу прафесію збоку, падаецца, што ваша жыццё — пастаянныя вандроўкі, новыя краіны, гарады... Ці ёсць у вас магчымасць пазнаёміцца з імі?***

— Мы бачым толькі борт самалёта знутры. І ў Астане, Маскве, Санкт-Пецярбургу, і ў Анталіі... Не маем магчымасці выходзіць, бо паміж рэйсам туды і назад — нешта каля гадзіны, і за гэты час нам трэба рыхтавацца да палёту... Але ж, якое б ні было надвор'е на зямлі, пры пад'ёме на вышыню над аблокамі заўсёды — сонца. Відовішча — узрушальнае! Паляпшае настрой, надае жыццёвую энергію, усяляе аптымізм і надзею на лепшае...

***— Я ведаю, што ў «Белавія» ёсць жанчына-пілот, Святлана Яроменка. Хацелі б засвоіць і гэтую прафесію?***

— У цяперашні час ужо дзве жанчыны працуюць пілотамі ў нашай авіякампаніі. Ёсць яны і ў іншых. Але ж не, я не хацела б. Справа ў тым, што я ўжо дастаткова даўно ў прафесіі, з 2010 года. Часта лётаю старшым бортправадніком на рэйсе, бо ў мяне за плячыма ўжо больш за пяць тысяч лётных гадзін. Дастойны заробак. Да таго ж і да пэўнага ладу жыцця прызвычайваешся. А навучанне для атрымання правоў пілатавання грамадзянскіх судоў — гэта вельмі працяглы і дарагі працэс.

***— Не магу не спытаць наступнае. У апошнія часы мы часта даведваемся пра аварыі самалётаў з вялікай колькасцю ахвяр. Не страшна лётаць?***

— У мяне ёсць цвёрдая ўпэўненасць у тым, што авіяцыя — самы бяспечны від транспарту. Наша праца пабудавана такім чынам, што раз-пораз даводзіцца лётаць у складзе іншых экіпажаў. А паколькі «Белавія» — кампанія невялікая, мы асабіста знаёмыя адно з адным — камандзіры паветранага судна, пілоты, бортправаднікі... І асабіста ў мяне — абсалютны давер да ўсіх калег, упэўненасць у іх прафесіяналізме.

***— Нялёгкая і адказная праца павінна быць узнагароджана дастойным адпачынкам...***

— Так. Водпуск у бортправаднікоў — 53 дні. Значыць, двойчы за год мы маем магчымасць добра адпачыць. Хаця гэта нават не магчымасць, а неабходнасць і патрабаванне, палітыка кампаніі.

***— Вы ў шлюбе. Прафесія мужа таксама звязана з авіяцыяй?***

— Не. Ён працуе ў сферы будоўлі. Зараз — на трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна. У пэўным сэнсе ў нас прафесіі-антаганісты: над зямлёй — і пад зямлёю...

***— Не так даўно вы сталі мамай. Па заканчэнні дэкрэтнага адпачынку плануеце вярнуцца ў прафесію?***

— Канешне! Іншых варыянтаў нават і не разглядаю!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ.**

Узяць вышыню

# СТРАХ ПАЛЁТАЎ

## Што рабіць, калі ў вас аэрафобія

**Статыстыка сцвярджае, што самалёт — самы бяспечны від транспарту. Аднак некаторыя адмаўляюцца ў гэта верыць: для аэрафобаў кожны пералёт становіцца моцным стрэсам. Маладыя людзі згадзіліся расказаць пра сваю боязь «нябесных падарожжаў».**

**Дар'я ДРАЗДОВІЧ, 21 год, рэдактар дзіцячага часопіса «Вытнік»:**

— Зразумела, што ў мяне аэрафобія, калі яшчэ падлеткам упершыню паляцела на самалёце ў Егіпет. Як толькі пачаўся рух па ўзлётнай паласе, мне зрабілася некамфортна. Да таго ж у мяне слабыя сасуды, таму ўвесь палёт нешта быццам ціснула на галаву. Было вельмі непрыемна ўсведамляць, што я знаходжуся на такой вышыні. Пасля пасадкі хацелася цалаваць зямлю і страшна было глядзець у неба. З таго моманту больш не лятала і ў найбліжэйшы час не планую. Сябры і блізкія ставяцца да маёй аэрафобіі скептычна, лічаць, быццам я сама сабе нешта надумала, а фізічная недамаганні на вышыні — толькі самаўнушэнне. Я не сумняваюся, што самалёт, сапраўды, самы бяспечны від транспарту. Але акрамя свядомасці ёсць падсвядомасць. На паветраны від транспарту я пагаджуся толькі ў самай крытычнай сітуацыі.

**Аляксандр СУДЗІЛОЎСКІ, студэнт IV курса Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва:**

— Адчуваю дыскамфорт, калі знаходжуся на вялікай вышыні. Для мяне паглядзець уніз з балкона пятага паверха — ужо выпрабаванне. Аднак з-за работы мне даводзіцца лятаць на самалёце некалькі разоў на год. Чакаючы свой рэйс, вельмі хвалююся, нават узнікаюць думкі адмяніць паездку. Але ў рэшце рэшт пераадольваю сябе і падымаюся на борт. Падчас палёту імкнуся перанакіраваць увагу, каб не думаць пра тое, што знаходжуся ў небе. Звычайна адкрываю ноўтбук і выконваю работу, якая патрабуе максімальнай сканцэнтраванасці. Часам справіцца са страхам дапамагаюць размовы з іншымі пасажырамі. Дарэчы, мой тата таксама не пераносіць пералётаў.

**Дар'я ВАРАБ'ЁВА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ:**

— У дзяцінстве баялася, што падчас узлёту і пасадкі мяне будзе вельмі моцна ўціскаць у сядзенне. Цяпер, канешне, мой галоўны страх — гэта магчымая авіякатастрофа. Боязь палёту асабліва ўзмацняецца, калі даведваешся пра падобныя падзеі ў СМІ. Аднойчы бацькі вырашылі мяне разыграць і сказалі, што праз тыдзень мы палятім на мора на самалёце. Я так спалохалася, што зачынілася ў сваім пакоі і плакала, пакуль мама не прызналася, што гэта быў жарт. Дарэчы, аднойчы з-за аэрафобіі я нават адмовілася ад падарожжа ў Іспанію. Магчыма, калі-небудзь пераадолець страх дапаможа каханы чалавек, які падчас палёту будзе моцна трымаць мяне за руку. Спадзяюся, неўзабаве я яго сустрэну, і мы разам адправімся ў Аўстралію.

**«Як жа пераадолець аэрафобію?» — з гэтым пытаннем мы звярнуліся да псіхолага Марыны САСНІНОЙ:**

— Перш за ўсё варта выявіць яе прычыну. Гэта могуць быць калісьці перажытая стрэсавая сітуацыя, працяглая дэпрэсія або іншыя тыпы расстройстваў. Таксама ўплываюць генетычная схільнасць, спадчынныя асаблівасці нервовай сістэмы. Ёсць меркаванне, што страх могуць адчуваць уражлівыя людзі, якія ўвесь час фіксуюцца на негатыўных падзеях. Боязь можа праяўляцца ў комплексе з іншымі фобіямі, напрыклад акрафобіяй (боязь вышыні). Звычайна аэрафобія ўзнікае ў моладзі, але яна можа развіцца ў любога чалавека падчас частых пералётаў.

### Вось некаторыя парады ад псіхолага, якія дапамогуць пераадолець страх:

- самаўнушэнне: трэба пераканаць сябе, што ўсё будзе добра, што наперадзе цэлае жыццё і ў яго на вас ёсць добрыя планы;
- дыхальная гімнастыка: у момант моцнага страху пачынайце лічыць, выдыхаючы ротам і ўдыхаючы носам паветра;
- падбярыце сабе цікавы занятак падчас пералёту: паслухайце музыку, паглядзіце фільм, пазнаёмцеся са спадарожнікам і правядзіце час у займальнай гутарцы;
- калі ёсць магчымасць, набывайце месцы бліжэй да носа самалёта, там ніжэйшы ўзровень шуму, што не так нервуе падчас палёту;
- дазвольце сабе з'есці штонебудзь салодкае, гэта павышае ўзровень цукру ў крыві і супакойвае нервовую сістэму.

Аднак для поўнага пераадолення аэрафобіі лепш звярнуцца па дапамогу да спецыяліста, бо сімптомы выяўляюцца як на фізічным, так і на псіхалагічным узроўні, а карані страхаў могуць знаходзіцца глыбока, і патрабуецца некаторы час для вырашэння гэтай праблемы.

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**



Ксенія КРЫВЕЦКАЯ

**На абвестку пра тое, што ў самы летні месяц «Маладосць» мяняе рэдакцыйны партф саквяжы, ель на чамаданы і дарожныя торбы чытачоў-сяброў-аўтараў, прыйшло шмат тэкстаў-вандровак. Адзін з іх прапануецца чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» ў скарачэнні, што, канешне, вельмі шкада, бо чытаецца ўвесь матэрыял на адным затоеным дыханні.**

# ВЯРШЫНІ

## *Урывак*

**ТУНЭЛІ.** У горы мы ехалі на цягніку. Чыгунка выгінаецца па схілах і пабудавана так, каб пасажыры змаглі ў поўнай меры ацаніць прыгажосць горнага пейзажу. Сустракаюцца старадаўнія арачныя масты. Масты, як стратэгічныя аб'екты, ахоўваюцца вартавымі. Я ўпершыню ў жыцці ехала праз тунэлі. Адчуванні, я вам скажу, неверагодныя: ты едзеш скрозь гару! Пабудаваныя яшчэ аўстрыйцамі, тунэлі і масты выдатна захаваліся і спраўна служаць чыгунцы да гэтага часу. Калі мы праязджалі праз самы доўгі тунэль (а ўсяго іх было чатыры), у вагоне ўключылі святло. Я чамусьці вельмі здзівілася. Думала, што мы застанёмся ў апраметнай цемры з незнаёмцамі, — сюжэт, упадабаны кіношнікамі, аднолькава прыдатны як для драматычнай, так і для камічнай сітуацыі.

**КАРПАТЫ.** Горы былі да нас добразычлівыя і гасцінныя. Як шмат залежала ад іх настрою і прыхільнасці! Бо яны проста маглі не дапусціць нас да сваіх прыгажосцяў, схаваўшыся за дажджамі. І мы праляжалі б на шэзлонгах пад навесам, уздыхаючы па згубленых магчымасцях. Вядома, у нас усё роўна былі б мілыя ўспаміны ад басейна ды СПА, дзіцячай гульнявой са спагаднымі аніматарамі, трохразовага харчавання «ад пуза», добразычлівага персаналу, тэрасы ў нашым нумары з відам на горы. Аднак усе гэтыя выгоды цывілізацыі пры ўсёй сваёй важнасці і незаменнасці не далі б нам таго, што дала прырода. Веласіпедныя прагулкі ўздоўж горных рэк, камяністыя сцежкі, узыходжанне да горных вяршынь, мігценне зорак на начным небасхіле. Такіх вялікіх, такіх яркіх зорак і такога чорнага-чорнага неба я яшчэ не бачыла. Лес пачынаецца проста каля тваіх ног і заканчваецца дзесьці ў небе. Так што глядзі ва ўсе вочы, каб, як у казцы, не зваліўся зверху які-небудзь велікан. Трэба сказаць, што такія даўгаствольныя яліны мне яшчэ не сустракаліся. У гарах лес шумны: вецер пастаянна перабірае кроны (але неяк выбарачна, не ўсе дрэвы яму даспадобы), рэчкі з плёскатам і цурчаннем абчэсваюць камяні.

Калі мы толькі прыехалі ў Карпаты (пасёлак Валавец), стаяла спякота пад трыццаць градусаў. Але ўжо літаральна праз гадзіну надвор'е стала змяняцца: з усходу прыплыла хмара, зачапілася за вяршыню гары і паліў дождж.

Ад Валаўца да Ждзеніева, дзе знаходзіўся гатэль, нас вёз загарэлы каравокі ўкраінец Іван. Вельмі-вельмі добразычлівы. Толькі такія людзі і сустракаліся ў Карпатах. Вядома, людзі ўсюды розныя, але ў нашым падарожжы нам сустракаліся толькі такія: спагадныя, неабыякавыя, хто любіць сваю Радзіму, з павагай ставіцца да сваёй гісторыі і шчыра цікавіцца гісторыяй нашага беларускага народа. Іван спытаў, чаму мы вырашылі прыехаць менавіта сюды. Мы адказалі: паглядзець горы. «А, наші зелені Карпаты», — сказаў ён, і мне гэта азначэнне ўрэзалася ў памяць. Так, не зялёныя яны, а менавіта «зелені», лепш і не скажаш, чым на іх роднай мове.

**ТУМАНЫ.** Відаць было, як хмары, чапляючыся за вяршыні гор, праліваліся дажджом. З пасёлка прыехала машына, уся мокрая, а ў нас яшчэ толькі хмурылася, бурчэла, гразілася. Пакуль мы агледаліся, прывыкалі да новага месца, дождж прайшоў. Дзе-нідзе з'явілася смуга: здавалася, гэта тыя хмары, якія нядаўна парвалі сваю адзежку аб вяршыні гор, неахвотна злазяць з нябёсаў, каб падабраць лахманы. Пад ноч туман ахутаў усю даліну, горы, неба. Былі відаць толькі найбліжэйшыя пабудовы. І недзе праз белую заслону чуўся шолах бязмежных лясоў і шум горных рэк. Туман жыў, накатваўся на сцены дамоў, апякаўся іх цяплом і, адскочыўшы, рабіў новыя і новыя спробы пранікнуць унутр чалавечага жытла, забрацца да спячага пад коўдру, выклікаўшы зябкія дрыжыкі. Можна было ўявіць, як несалодка прыходзілася тым, хто начаваў у палатцы.

**СОНЦА** ў гарах устае доўга. Пакуль пераадолее ўсе гэтыя вяршыні і хрыбты, ты ўжо зачакаешся: калі ж! І ўжо светла, а яго ўсё няма. Сонца ў гарах гультаяватае. Яно не адразу паказваецца, не адразу разганяе туман, змахваючы яго то з адных, то з другіх верхавін дрэў. Але вось і Сонца! Добры дзень, Сонца! Добры дзень, Горы! Добры дзень, новы Дзень! Сонца свеціць проста на нашу тэрасу, і ў вокамгненне становіцца ярка і цёпла. У сонечных прамянях скачуць пушынкі і ўюцца розныя мушкі, як у пыльным пакоі.

**ГАРА ВЫСОКІ КАМЕНЬ.** Да падножжа гары, дзе пачынаецца сцежка, мы даехалі на веласіпедах. Галоўнае, не прапусціць паказальнік, які знаходзіцца літаральна каля першага дома пасёлка Ждзеніева. Дакладней, па-за ім, каля самага лесу. Знаходзіш пачатак сцежкі — і можна пачынаць узыходжанне. Дапамога інструктара нам не спатрэбілася: на ствалах ёсць спецыяльныя пазнакі, якія падказваюць, што вы на правільным шляху. Таму ішлі мы без правадніка ды іншых турыстаў. Нашага маленькага падарожніка з намі таксама не было, бо складана яму яшчэ так высока караскацца. Сцежка вяла нас праз лес, які станавіўся радзейшы бліжэй да вяршыні. Зусім хутка ў прасветах паміж дрэвамі мы ўбачылі вышыню, на якую падняліся. Гэта прымусіла мяне схапіцца за ствол хвоі, удыхнуць і выдыхнуць, перш чым працягнуць шлях. Для мяне, ураджэнкі Палескай нізіны, любы пагорак — гара. Тут жа было, мабыць, з паўкіламетра, а трэба было вышэй. Калі выбраць патрэбны тэмп, падымацца зусім нескладана, тым больш што надвор'е самае ўдалае: сонца падсушыла зямлю пасля ўчарашняга дажджу, спякота адступіла, вецер быў цёплы і адганяў ад нас камароў. А горы працягвалі дарыць нам свае падарункі. Зялёныя камяні, мох на ствалах дрэў казалі нам пра тое, што ранняй вясной тут сыходзяць у даліну патокі расталага снегу. Кветка на невялікім кусціку шыпшынніку, як ружовы матылёк, прынесены сюды невядома з якіх далячынь. А на вяршыні — такі від! Такое захапленне і хваляванне! Страх і шчасце! І мы ўдваіх, толькі мы, а вакол горы, а ўнізе — вёсачка, рэчкі, лес, дарога і зноў горы, горы, горы. Мы былі цалкам задаволены сваім паходам, а па дарозе назад ужо загарэліся ідэяй забрацца на наступную гару — Пікуй. Пра гэта імкненне ўжо праспяваў некалі Высоцкі: «Лучше гор могут быть только горы, // На которых ещё не бывал».

**ГАРА Пікуй.** Шлях пачаўся з сяла Беласовіца, куды нас прывёз на машыне інструктар Васілій. Да ўзыходжання на гэтую гару лепш быць хоць бы мінімальна падрыхтаваным: спартыўнае адзенне і абутак, шапка, заплечнік з самым неабходным, бо невядома, як вам дасца пад'ём. Для нас у інструктара з сабой былі ланч-боксы гатэля з абедам, дадатковыя курткі, сродкі ад камароў і ўкусу гадзюкі і нават палкі для скандынаўскай хады, калі стомяцца ногі (яны не спатрэбіліся, але вельмі парадавала прадбачлівасць нашага праваднікa).

Калі ўсё квітнее і паветра напоўнена летнімі водарамі, убачыць снег — сапраўдны цуд. Хіба не цуд у пачатку мая ляпіць снегавіка і кідацца снежкамі амаль за тысячу метраў над узроўнем мора?! А як толькі выходзіш з лесу, пачынаюцца лугі. Вецер дзьме са страшнай сілай, не мяняючы свайго кірунку. Дзьме так, быццам хоча садзьмуць казюльку-чалавека ў даліну, дзе яму і месца. Моцны вецер — асноўная прычына таго, чаму людзі будуюць свае гнёзды каля падножжа гор. Тут нават дрэвы нейкія нізкарослыя, з пакручанымі галінамі. На лугах расце шмат чарніц. Гэта незвычайна, бо ў нас чарніцы — гэта лясная і балотная ягада, а тут луг і вяршыня гары. І была яшчэ сустрэча з гадзюкай! Інструктар сказаў: «Стой!» — і літаральна праз некалькі крокаў прамільгнула чорная стужка і знікла ў траве. Як высветлілася, змеі тут сустракаюцца часта — любяць грэцца на камянях пад сонейкам.

І так ідзеш, караскаешся, перавальваеш цераз горны хрыбет — і вось тое, дзеля чаго трэба было пераадолець усе цяжкасці. Тваім вачам адкрываецца такі від, і адчуванні, быццам ты знаходзішся на вяршыні свету. Свет бачыцца ў аб'ёме: неба, зямля, рэкі, горы, з якіх можна бачыць чатыры дзяржавы — Славакію, Польшчу, Румынію і Украіну. «Весь мир на ладони — ты счастлив и нем // И только немного завидуешь тем, // Другим — у которых вершина ещё впереди» (У. Высоцкі, «Вяршына»). Калі ўжо пасля ўсяго глядзіш знізу на гару, усё роўна не верыцца, што гэтая вяршыня скарылася, бо здаецца, што да яе некалькі дзён шляху.

У гарах ты пастаянна адчуваеш сябе шчаслівым. Можа, таму, што пераадольваеш сябе: мускульнае напружанне, страх — і ганарышся сабой. Можа, таму, што ты пазбаўлены руціны і побыту, вольны запаўняць свой дзень тым, што табе цікава. Можа, таму, што ўвесь час знаходзішся са сваёй сям'ёй, бачыш дарагіх табе людзей радаснымі, падзяляеш з імі свае эмоцыі. Бо мясцовыя ў гэты ж самы час працягваюць жыць сваім звычайным жыццём, вырашаюць надзённыя праблемы. Земляробства ў іх не развіта з-за камяністай глебы, заводаў і калгасаў даўно няма, і літаральна адразу пасля школы маладыя людзі (тыя, якія не знаходзяць працу ў сферы абслугоўвання турыстаў) вымушаны з'ехаць за мяжу.

**ДЗІЦЯ.** Пасля паездкі ў нашага сына з'явіліся новыя параўнанні. Напрыклад, ён так ахарактарызаваў старэнне чалавека: «Ты будзеш змяншацца, як старыя горы». Усё ж такі, калі дзіця падрастае, падарожжа пашырае яго кругагляд. Мы рабілі з ім невялікія пад'ёмы, веласіпедныя прагулкі, праходзілі вераўчаную дарогу, ездзілі на экскурсіі, плюс зарадка на свежым паветры, танцы і гульні з аніматарамі — усё гэта так вымотвала нашага сына, што пасля «адбою» ён засынаў моцным сном. Можна было размаўляць на ўвесь голас і спакойна адпраўляцца на вячэрні шпацыр. Парада: калі ў вас гіперактыўнае эмацыянальнае дзіця — вязіце яго ў горы.

**«КАРПАТЫЯ» Ў КАРПАТАХ.** У якасці казкі на ноч я ўзяла з сабой кнігу Майкла Марпурга «Каспар, прынц катоў». Галоўны герой, хлопчык Джоні, пасябраваў з чорным катом па мянушцы Каспар. У працэсе развіцця сюжэту яны трапляюць на «Тытанік» і тых, хто выжыў пасля крушэння, ратуе параход «Карпатыя». Дзіўна тое, што ў першы ж вечар нашага знаходжання ў гарах мы пазнаёміліся з гатэльным катом, абсалютна такім жа чорным і гладкім, як на ілюстрацыях у кнізе. Натуральна, мы адразу празвалі яго Каспарам, і ён ахвотна адгукаўся на гэтую мянушку. Ну а «Карпатыя» ў Карпатах... Можа, таксама з'явілася невыпадкова?

**НОЧ у гарах.** Гуляючы, мы адышлі далей, туды, дзе канчаецца вулічнае асвятленне, — і ўбачылі ашаламляльнае зорнае неба. Яно літаральна абрынулася на нас. Гэта як нырнуць у іншае вымярэнне. Космас проста над галавой, мігценне зорак, Млечны Шлях. Руку працягні — і здымеш любы ўпадабаны зіхатлівы крышталік. Горны лес, такі жывы, такі шумны. Нават не трэба было далёка паглыбляцца — хапіла ўражанняў і так: густая чарната вакол, шум лесу і зоркі, зоркі! З гарамі хочацца гаварыць, хочацца дзякаваць ім за дары — цудоўнае надвор'е, прыгожыя віды, яшчарку (якую так марыў убачыць наш сын і якая выскачыла яму проста пад ногі, а затым доўга пазірала, перш чым уцячы), шыпшыннік на схіле, елачкі ў тры сантыметры вышынёй, маленькія і кранальныя ў сваім імкненні жыць. Пахі такія знаёмыя, якія нагадваюць маё дзяцінства. І дзіўна, што і ў людзей знаёмыя твары. Час пастаянна гуляў са мной, заводзіў у забытыя куткі памяці. То кружыў на месцы, то ўцякаў наперад. І так добра было на вуліцы: не горача і не холадна, не слізка і не суха. Ідэальна. А хутка з'язджаць.

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Западэлектросетьстрой» (Продавец).**

**Лот № 1.** Комплекс зданий и сооружений производственной базы. Состав:

1. Здание конторы с инв. № 700/С-6124,1967 г. п. Площадь – 433,6 кв. м. Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание конторы. Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Калужская, 37.

2. Здание склада-кузницы-мехмастерской с инв. № 700/С-5946, 1955 г.п. Площадь – 205,9 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание склада-кузницы-мехмастерской. Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Калужская, 37.

3. Здание мастерской-пилорамы с инв. № 700/С-5628, 1962 г.п. Площадь – 127,2 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание мастерской-пилорамы. Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Калужская, 37.

4. Здание материального склада с инв. № 700/С-6127, 1967 г.п. Площадь – 713 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание материального склада. Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Калужская, 37.

